Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СНЕЖАНЬ 11 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 273 (4817)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

АБ ПАКАРАННЯХ ВІНАВАТЫХ У ВЫПУСКУ НЯДОБРАЯКАСНАЙ або НЕКАМПЛЕКТНАЙ ПРАДУКЦЫІ

Пастанова ЦК КП(б)Б

Улічваючы ўсю важнасць і своячасовасць пастановы ЦВК і СНК СССР аб пакаранні вінаватых у выпуску нядобраякаснай або некамплектнай прадукцыі, бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

Прапанаваць гаркомам і райкомам КП(б)Б абгаварыць пастанову ЦВК і СНК СССР на пасяджэннях бюро ГК і РК з выклікам трыкутнікаў прадпрыемстваў і прыняць суму мерапрыемстваў па сутнасці гэтай пастановы.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Сустрэнем з'езды партыі вялікімі поспехамі ў партыйнай вучобе

Мы будуем соцыялізм. Мы на парозе другога года 2-й пяцігодкі. Мы на парозе 17-га і 15-га партыйных з'ездаў. З'езды намецяць далейшыя шляхі пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства. Член партыі павінен разумець, чаму мы будуем соцыялізм. «Наша-ж вера ў соцыялізм адрозніваецца ад рэлігійнай веры іменна тым, што наша вера навуковая, яна грунтуецца на нашых ведах. Мы верым у соцыялізм не таму, што жадаем, а верым таму, што мы бачым на аснове навуковага марксіцка-ленінскага аналіза немінучасць тібелі капіталізма, немінучасць перамогі соцыялізма» (Каганові ч).

Пабудова соцыялістычнага грамадства ў 2-й пяцігодцы патрабуе шчучай барацьбы з рэшткамі капіталізма, з апартунізмам, з шавінізмамі ўсіх колераў. Пад ударамі наступаючага соцыялізма клавы вораг становіцца ўсё больш хітрым у сваім супраціўленні, прыстасоўваючы да самых тонкіх метадаў дыверсіі. Каб разгледзець замаскіраванага ворага, каб умець выкрыць яго, трэба ўзброіцца высокай рэвалюцыйнай пільнасцю і большасцю сарваць маску з ворага. Гэта якасць даецца ў рэвалюцыйнай тэорыі Маркса-Леніна-Сталіна.

Адлюстраваннем новай тактыкі класавага ворага з'яўляюцца такія формы праяўлення апартунізма ў сярэдзіне партыі, як аліэлуйшчына і двурушніцтва, славесныя запэўнення ў вернасці лініі партыі, падрыў гэтай лініі партыі на справе. Вось чаму ў другім пункце пастановы ЦК і ЦКК аб чыстцы ўказана, што ў партыі вычышчаюцца «двурушнікі, якія жывуць ашуканнем партыі, утойваючыя ад яе свае сапраўдныя імкненні і пад прыкрыццём іжлывай клятвы ў «вернасці» партыі, прабуючыя сарваць на справе палітыку партыі».

На чыстцы мы бачылі гэтых двурушнікаў, бачылі, як яны прыкідваліся бяскрыўднымі і нявінными людзьмі. Але мы іх выкрылі і выгналі з партыі. Чыстка на шматлікіх фактах паказала і яшчэ раз даказала, што суддзіць трэба аб комуністах не па яго словах, а па яго справах. Але і справы трэба разумець, трэба разумець, наколькі гэтыя справы адпавядаюць лініі партыі. Трэба ўмець адрозніваць злыдства ад рэвалюцыйнай практыкі. Дзялцтва не ведае рэвалюцыйных перспектыў і ставіць сёння інтарэсы ведамства вышэй інтарэсаў класа ў цэлым, дзяржавы ў цэлым. Рэвалюцыйная практыка не траціць рэвалюцыйных перспектыў, бо яна абгрунтавана на палітычнай лініі партыі, якая кіруецца выяўленнем марксіцка-ленінскай тэорыі.

Чыстка партыі як нельга лепш паказала, якое адрамадзнейшае значэнне мае ідэалагічная ўзброенасць членаў партыі. Аднак, не ўсюды яшчэ зрабілі для сябе ўрока з чыстки.

Возьмем к прыкладу завод «Комунар» (Менск). Там са 103 комуністаў паведзвае партшколу ў сярэднім 10 чалавек. Кандыдацкая школа развалілася. Гурток ленінізма ня вось ужо месяц як зусім не займаецца.

На фабрыцы імя Кагановіча (Менск) з 210 комуністаў пры чыстцы пераведзена ў кандыдаты 25 чал., у спачуваючыя 27 чал., выключана з партыі 41 чал. Не глядзячы на ўсё гэта пасля чыстки няма рашучага пералома ў партвучобе. Партшкола і гурткі арганізаваны не па вытворчаму прынцыпу. У кандыдацкай школе навучанне складае толькі 40 проц., у партшколе — 50 проц. Партвучоба спачуваючых і кандыдатаў да гэтага часу яшчэ не наладжана.

Дрэнна справа з партвучобай і ў радзе другіх паркалектываў Менска (ф-ка імя 8 сакавіка, завод лапцоў Галла, пагельні і г. д.). Абстаўленне партвучобы ў Менску, заведзенае культпропам ЦК, паказала, што бюро парткалектываў, а таксама культпропы гаркома не забяспечваюць канкрэтнага і аперацыйнага кіраўніцтва марксіцка-ленінскай вучобай.

Нядаўна праведзеная ўсебеларуская пераклічка выявіла слабы стан партвучобы і ў Гомелі, і ў Віцебску. Усё гэта гаворыць аб тым, што ў нашых буйнейшых пролетарскіх цэнтрах не здолелі выкарыстаць тых вялікіх магчымасцей, якія там ёсць для арганізацыі і шырокага разгортвання партвучобы.

Яшчэ горш з партвучобай у сельскіх раёнах. Вось некаторыя лічбы. У Асіпавіцкім раёне ахоплена партвучобай усяго 47 проц. парт-арганізацыі, у Вушацкім — 31, у Касцюковіцкім — 65; у парыцкай партарганізацыі з 102 чал. партактыва займаецца ў школах усяго 12 чал. У Бешанковіцкім раёне партвучоба фактычна сарвалася; у Чэрыкаўскім раёне ў радзе ячэек партвучоба яшчэ не пачалася, а ў другіх яна правоцэіцца пры вельмі нізкім процанце наведвання. Трэба прама сказаць, што значная частка райкомаў партыі ўсё яшчэ недаацэньвае важнасці партвучобы, не кіруе ёю як адным з адказнейшых участкаў партыйнай работы.

Поўная бестурботнасць у адносінах партвучобы праяўляецца ў вельмі многіх ячэйках совецкіх устаноў. Возьмем ячэйку Наркамфіна. На чыстцы гэтай ячэйкі была выяўлена вялікая груша комуністаў палітычна зусім няграматных. Пасля чыстки прайшло паўтара месяца і аб партвучобе яшчэ і думаць не пачалі.

У ячэйцы ДВБ з 24 комуністаў фактычна займаецца: у гуртку па ленінізме 1-2 чал., у гуртку па гісторыі партыі — 2-3 чал. У ячэйцы Наркамгаса да партвучобы яшчэ не прыступілі.

Запытайце ў любога сакратара ячэйкі совецкай установы аб прычынах правала партвучобы, і ён вам у адказ выкладзе дзесяткі «аб'ектыўных» прычын. На самой-жа справе правал партыйнай вучобы ва многіх совецкіх ячэйках тлумачыцца няўменнем, а вельмі часта і нежаданнем арганізаваць гэту вучобу, апартуністычнай недацэнкай рэвалюцыйнай тэорыі з боку бюро ячэек. У совецкіх ячэйках многія комуністы заражаны чванствам, лішняй самаўпэўненасцю, лічачы, што «мы даволі палітычна граматныя і займацца нам не варта». **Такім антыпартыйным настроям трэба даць рашучы адпор.**

У партыйнай вучобе рашаючае звяно — гэта **якасць прапагандыстаў.** Аднак, на гэты бок справы вельмі часта не звяртаюць увагі. Вось, напрыклад, у м. Янавічы, Суражскага раёна, прапагандыст **Перапечын** у гуртку па ленінізму гаворыць яўную бяссэнсіцу, называе соцыялістам-утапістам засна вальніка люцеранства — Люцера. Гэты-ж прапагандыст не змог адказаць на пытанне слухачоў — калі заснаваўся II Інтэрнацыянал. На аршанскім хлебазаводзе прапагандыст **Галенка** — палітычна малаграматны чалавек — ператварае заняткі ў карыкатуру на партвучобу. На фабрыцы імя Кагановіча прапагандыст **Якубчык** у гуртку па ленінізму займаецца вывучэннем Луі Блана, Огюста Бланкі і Пруцона, зусім абыходзячы асноўныя пытанні ленінізма. На фабрыцы імя 8 сакавіка прапагандыст **Камароў** на заняткі сказіў сутнасць права ўхіла і контр-рэвалюцыйнага трацкізма.

Такіх фактаў проста здзіўляння з слухачоў, тарабарышчыны і халтуры можна было-б прывесці і больш. Але і гэтых даволі для таго, каб звярнуць увагу на **неабходнасці найстражэйшай праверкі прапагандыстаў,** як гэтага патрабуюць культпропы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

У стане партыйнай вучобы павінен быць створан рашучы пералом. Аб магчымасці добрай арганізацыі партыйнай вучобы гаворыць поспехі барысаўскай партарганізацыі, парткалектыва завода «Большэвік», хойніцкай партарганізацыі і рада іншых.

На ўсебеларускай нарадзе па партвучобе многія партарганізацыі заключылі паміж сабой дагаворы аб соцыялістычным спаборніцтве на лепшую пастаноўку партвучобы і заваяванне пераходнага сцяга «Звязды». Пакуль алчувальных рэзультатаў яшчэ няма. Гэтых рэзультатаў трэба дабіцца ва што-б там ні стала. Справа заключаецца толькі ў тым, каб райкомы партыі ўзялі справу партвучобы пад свой непасрэдны нагляд, каб культпропы райкомаў сталі сапраўднымі **арганізатарамі** партыйнай вучобы.

На барацьбу за заваяванне пераходнага сцяга «Звязды», трэба арганізаваць усіх слухачоў партыйных школ і гурткоў, арганізаваць **на справе** шляхам сапраўднага соцыялістычнага спаборніцтва паміж школамі, гурткамі і асобнымі таварышчамі. Партыйныя арганізацыі павінны ўзяцца за партыйную вучобу **па-большэвіцку.**

АБ ХОДЗЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б) АБ ПЕРАСТРОЙКІ ПАРТСЕТКІ НА ВЁСЦЫ

Пастанова ЦК КП(б)Б

(Прынята на падставе вынікаў куставых партнарад)

1. ЦК КП(б)Б адзначае, што перастройка партарганізацый вёскі па вытворчаму прынцыпу прывяла да значнага пашырэння партсеткі і ахопа ёю да 80 проц. калгасаў, лепшай расстаноўкі партыйна-комсамольскіх сіл і да ўмацавання калгасаў новымі партработнікамі за лік рэспубліканскага і раённага актыва, а таксама перавода сельскіх комуністаў у калгасы, што значна ўзмацніла партыйны ўплыў на ўсе працэсы калгаснай вытворчасці.

ЦК адзначае, што ў зонах дзейнасці МТС палітадзелы дабіліся ў выніку праведзенай перастройкі партыйнай арганізацыі па вытворчаму прынцыпу падняцця на значна большую вышыню справы кіраўніцтва арганізацыйна гаспадарчым умацаваннем калгасаў і барацьбы за ператварэнне іх у большэвіцкія калгасы.

2. У радзе раёнаў (Барысаў, Орша, Бабруйск, Рагачоў і інш.) палітадзелы МТС і райкомы партыі, правільна праводзячы ў жыццё пастановы ЦК УсеКП(б) і бюро ЦК КП(б)Б аб перастройцы, дабіліся значных вынікаў па ажыццяўленню канкрэтнага і аперацыйнага кіраўніцтва работай ячэек, парторгаў, прымацаваных да калгасаў раённых работнікаў, па разгортванню партыйна-масавай і арганізатарскай работы ў калгасах, брыгадах і па стварэнню моцнага калгаснага актыва.

3. Побач з гэтым многія РК К(п)Б, асабліва Магілеўскі, Мсціслаўскі, Сіроцінскі, Лёзненскі, Горацкі, Дубровенскі і інш., абмежаваліся фармальнай перастройкай не забяспечылі ваят перавода комуністаў з раённых і сельскіх устаноў у калгасы, фармальна адносіся да падбора кіраўнікоў пізавых парт'ячэек і да прымацавання райпартактыва, асабліва да калгасаў у раёнах дзейнасці палітаддзелаў МТС, не арганізавалі пастаяннага аперацыйнага і канкрэтнага кіраўніцтва калгаснай ячэйкай, парторгам, не дабіліся сапраўднай праверкі работы прымаценанага гарадскога і раённага партактыва да пачтых калгасаў, не арганізавалі сапраўднай дапамогі і сакзейнасці палітаддзелам МТС у перастройцы вясковай парт арганізацыі.

Гэта сведчыць аб тым, што многія райкомы партыі не зразумелі асноўнага сэнса пастановы ЦК УсеКП(б) аб калгаснай ячэйцы, які заключаецца ў карэннай змене метадаў арганізацыйна-партыйнай і масавай работы на вёсцы, і па сутнасці продаўжаюць чаканцца за ажыццяўленне формы кіраўніцтва і кампанейскія метады работы замест непасрэднага нагляду, каб культпропы райкомаў сталі сапраўднымі **арганізатарамі** партыйнай вучобы.

На барацьбу за заваяванне пераходнага сцяга «Звязды», трэба арганізаваць усіх слухачоў партыйных школ і гурткоў, арганізаваць **на справе** шляхам сапраўднага соцыялістычнага спаборніцтва паміж школамі, гурткамі і асобнымі таварышчамі. Партыйныя арганізацыі павінны ўзяцца за партыйную вучобу **па-большэвіцку.**

боку райкампартаў, комсамола і слабага канкрэтнага кіраўніцтва з боку ЦК ЛКСМБ перастройкай комсамольскай сеткі на вёсцы.

Лічачы такое становішча з перастройкай сельскай партарганізацыі нецярпімым, ЦК КП(б)Б патрабуе ад кожнага РК КП(б)Б большэвіцкай рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб калгаснай ячэйцы. У прыватнасці ЦК прапануе Магілеўскаму, Мсціслаўскаму, Сіроцінскаму, Горацкаму, Лёзненскаму, Дубровенскаму РК КП(б)Б канчаткова ліквідаваць адставанне ў перастройцы партарганізацыі і забяспечыць сапраўдную пераклічку комуністаў з раённых і сельскіх устаноў у калгасы, у першую чаргу ў калгасы раёна дзейнасці палітаддзелаў МТС.

4. Скарыстоўваючы станоўчы вопыт перадавых раёнаў і палітаддзелаў МТС, ГК і РК КП(б)Б абавязаны забяспечыць пастаяннае кіраўніцтва пізавой партсеткай, асабліва комуністамі—адзіночкамі ў калгасах, шляхам перастрадных выездаў членаў бюро райкомаў і прэзідыума райКК у калгасныя парт'ячэйкі для жывога інструктажа, практыкаваць пастаянны абмен вопытам работы шляхам склікання куставых нарад сакратароў ячэек, канцыдацкіх груп, кіраўнікоў партыйна-комсамольскіх ядраў і комуністаў —адзіночак, выклікі сакратароў і парторгаў на бюро РК, асвятляючы іх работу ў раённым і калгасным друку.

Неабходна, у прыватнасці, папрыць вопыт вядзення дзённіка-задання на дэкаду кіраўніком пізавой калгаснай партарганізацыі ў кожным калгасе з праверкай выканання даручаемых заданняў.

Абавязаць партвыдавецтва з дапамогай аргінстра ЦК і палітсектара Наркамзёма забяспечыць у бліжэйшыя 3-4 месяцы выданне цалай серыі (не менш 10 кніг) зборнікаў і брашур.—«У дапамогу пасковаму партработніку», асвятляючы ў іх пытанні партбудаўніцтва і лепшага вопыта партработы ў вёсцы.

Ухваліць прапанову партнарады бабруйскага пуста арганізаваць па старонках газеты «Звязда» з 5-XII усебеларускую пераклічку сакратароў калгасных парт'ячэек і парторгаў па абмену вопытам партработы ў сувязі з перастройкай, уняв заўпы гэта з падрыхтоўкай па справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторгаў і з'езда КП(б)Б. Даручыць аргінстру, культпропу ЦК і рэдакцыі газеты «Звязда» арганізаваць гэту работу.

5. Прапанаваць райкаткомам і палітаддзелам МТС забяспечыць сістэматычную праверку работы прымацаваных у якасці парторгаў раённых і гарадскіх работнікаў, а таксама членаў тарытарыяльных ячэек, дыферэнцыюючы работу сярод іх.

6. ЦК КП(б)Б звяртае асаблівую ўвагу райкомаў КП(б)Б на правядзенне адзіных партыйных, комсамольскіх, саюзных і палітдзён па канкрэтных пытаннях палітычнага і вытворчага жыцця калгасаў.

7. Даручыць аргінстру ЦК і палітсектару Наркамзёма прапрацаваць і прадставіць на бюро ЦК палажэнне аб рабоце парторгаў і кіраўнікоў партыйна-комсамольскіх ядраў і на зацвярджэнне сакратарыята—планы мерапрыемстваў па куставой перападрыхтоўцы кіраўнікоў пізавога калгаснага парт звяна, прадугледжваючы арганізацыю пастаянных курсаў пры палітаддзелах і ў раёнах, а таксама распрацаваць план выклікаў у ЦК асобных сакратароў і загатчыкаў арганаддзелаў райкомаў і нач. палітаддзелаў з дакладамі аб рэалізацыі пастановы Бюро і Сакратарыята ЦК аб перастройцы.

Даручыць аргінстру ЦК абследаваць некалькі калгасных парт'ячэек, партыйна-комсамольскіх ядраў і парторгаў (характэрных для большасці партарганізацый Беларусі) і заслухаць іх на бліжэйшым пасяджэнні Сакратарыята ЦК з мэтай прыняцця разгорнутай пастановы аб іх рабоце.

8. Даручыць культпропу ЦК распрацаваць і прадставіць на Сакратарыят ЦК плян канкрэтных мерапрыемстваў па арганізацыі парт асветы ў пізавой сельскай партсеткі.

ЦК КП(б)Б асабліва падкрэслівае задачу партарганізацый — разгарнуць большэвіцкую работу па марксіцка-ленінскаму выхаванню на канкрэтных участках палітычнай і вытворчай работы кандыдатаў партыі і спачуваючых, забяспечыўшы сапраўднае кіраўніцтва групамі спачуваючых.

9. Абавязаць сакратароў райкомаў партыі скончыць па працягу бліжэйшых дзён арганізацыйную перастройку комсамольскай сеткі на вёсцы, даручыўшы гэту справу персанальна загатчыкам арганаддзелаў РК КП(б)Б, сакратарам райкомаў і пам. нач. палітаддзелаў па комсамолу.

Даручыць ЦК ЛКСМБ і палітсектару Наркамзёма забяспечыць практычнае кіраўніцтва перастройкай шляхам перасылкі і зацвярджэння комсамольскай сеткі на вёсцы ў кожным раёне.

10. ЦК звяртае ўвагу райкомаў і палітаддзелаў сустрэчу па недастатковую перастройку парт-арганізацый соўгасаў па вытворчаму прынцыпу і прапануе забяспечыць ахоп важнейшых вытворчых участкаў (ферм, палявочных брыгад) партыйным уплывам.

11. ЦК падкрэслівае, што галоўным і асноўным у перастройцы партсеткі з'яўляецца ў сучасны момант умацаванне калгаснай ячэйкі і астатніх вытворчых парт звенняў, палепшэнне зместу іх работы і кіраўніцтва імі з боку палітаддзелаў і райкомаў, сапраўднае падняцце на аснове перастройкі кіруючай арганізатарскай ролі сельскай партарганізацыі ў цэлым і авангардная ролі кожнага сельскага камуніста ў асобку, вырошчванне калгаснага актыва на канкрэтнай барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае і палітычнае ўмацаванне калгасаў, за большэвіцкія калгасы.

АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ І КАЛГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

Пастанова пленума ЦК КП(б)Б

1. Пленум ЦК КП(б)Б даручае Бюро ЦК, на аснове абмена думкамі на пленуме па дакладах сакратароў РК і начпалітаддзелаў Дрысенскага, Мсціслаўскага і Шклоўскага раёнаў аб ходзе загатовак ільну і сакратароў і начпалітаддзелаў Слуцкага і Рагачоўскага раёнаў аб пытаннях калгаснага будаўніцтва, у дадатак да ўжо прынятых пастаноў бюро, намеціць практычныя канкрэтныя мерапрыемствы, забяспечваючыя:

а) **па ільну** — правядзенне ў вызначаныя тэрміны загатовак з прыняццем рашучых мер у адносінах тых раённых партыйных арганізацый і работнікаў праўленняў калгасаў, членаў сельсоветаў, якія не разгарнулі большэвіцкай работы па апрацоўцы і загатоўцы ільну і асабліва не вядуць барацьбу супроць кулацкага сабатажа ільнозагатовак.

б) **Па пытаннях калгаснага будаўніцтва** — падкрэсліваючы недавальняючы стан работы па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў у БССР (падрыхтоўка кадраў, умацаванне вытворчай брыгады, звяна, пытанні прадукцыйнасці працы, дысцыпліны, норм выпрацоўкі, размеркаванне даходаў і г. д.) і як вынік — недастатковая работа па арганізацыі новага прыліва ў калгасы, а таксама рад прарываў (па рамонту трактараў, засыпцы насенных і страхавых фондаў, па выкананню дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб пёлках для бескароўных калгаснікаў, становішча кадраў у калгасе) — прыняць дадатковую суму канкрэтных практычных мерапрыемстваў, забяспечваючых ужо ў снежні месяцы рашучы пералом у гэтых важнейшых работах, забяспечваючы гэтым самым найбольш паспяховае чым калі-б там ні было правядзенне веснавой сяўбы 1934 г.

Па засыпцы-ж насенных і страхавых фондаў работа павінна быць скончана не пазней 15 снежня.

Пры засыпцы важнейшай справай лічыць выкананне поўнасцю плана засыпкі добраякаснага высокататуновага насення аўса, ільну, яравой пшаніцы.

2. Неаджлацца пасля скончэння пленума накіраваць у дапамогу раёнам максімум работнікаў з рэспубліканскага актыва (не менш 300 чал.), асабліва ў ільняныя раёны.

Даручыць усім ГК і РК КП(б)Б са свайго боку накіраваць увесь раённы актыў на месцы ў дапамогу соўгасам і калгасам па выкананне важнейшых задач у гэтай галіне.

3. Даручыць ЦКК КП(б)Б устанавіць штодзённы кантроль за выкананнем дырэктыў партыі і ўрада па пытаннях барацьбы за лён і калгаснае будаўніцтва, прыцягваючы да суровай адказнасці вінаватых у зрыве гэтых важнейшых пастаноў.

Ліст тав. ГІКАЛО

АД УДАРНІКАЎ КАЛГАСА „ШТУРМОВЕЦ 2" ДЗЯРЖЫНСКАГА Р.

ПАВАЖАНЫ ТАВ. ГІКАЛО!

Сабраўшыся на сход абмеркаваць практычныя пытанні падрыхтоўкі да надыходзячага XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда УсеКП(б), мы аднадушна парашылі звярнуцца да вас, тав. **ГІКАЛО,** з лістом, у якім ад шчырага сэрца хочам расказаць аб нашай рабоце, аб рабоце па завяршэнню бягучага гаспадарчага года і падрыхтоўцы да вясны другога года пяцігодкі пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства.

Не будзем спыняцца на гісторыі арганізацыі нашага калгаса, не будзем гаварыць аб труднасцях і перашкодах, якія сустракаліся на нашым шляху. Каму не вядомы самыя рознастайныя манеўры кулацтва ў яго шалёным супраціўленні калгаснаму будаўніцтву. **Але няма тых перашкод, якіх-бы не перамагала наша партыя.**

Пад кіраўніцтвам партыі разгромлена кулацтва як клас. У вёсцы канчаткова замацован калгасны лад. Аб'яднанае ў калгасы бядняцка-серадняцкае сялянства атрымала ад соцыялістычнай прамысловасці ўсё необходнае для паспяховага развіцця буйнай калектыўнай гаспадаркі. Прадсядаўскую саху змяніў трактар. Ручны серп і дубовы цэп выцясняюцца жніваркамі, машынамі, камбайнамі. **І праца наша становіцца лягчэйшай, культурнай і прадукцыйнай.**

У асобе палітаддзела МТС мы атрымалі моцнае большэвіцкае кіраўніцтва і дапамогу.

Усё гэта разам узятае забяспечвае паспяховае ажыццяўленне лозунга правадыра партыі і сусветнага пролетарыята тав. **СТАЛІНА** аб большэвіцкіх калгасах і заможнасці калгаснікаў.

Калі вярнуўся з усесаюзнага злёта калгаснікаў-ударнікаў наш делегат — лепшы брыгадзір тав. **Серак Алесь** і расказаў нам пра прамову тав. Сталіна, — гэта надало нам яшчэ больш сілы і натхнення ў нашай рабоце. Толькі паасобныя скептыкі, кулацкія падпявалы па закутках шушукаліся: «Доўга чакаць прыдзецца заможнасці».

Вядома, заможнасць сарока на хвасце нікому не прыносіць. Заможнасць у калгасе даецца добрасумленнай, чэсная працай.

«Варта толькі палепшыць скарыстанне машын і трактараў, варта толькі палепшыць апрацоўку зямлі, — і мы пабачым таго, што павялічым кошыкасць нашых прадуктаў суткі-ўтрая. А гэтага вусім даволі для таго, каб зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі працаўнікамі калгасных палёў».

Гэтыя словы правадыра партыі наш Серак Алесь прачытаў нам на сходзе са свайго дэлегацкага блакнота.

Якія простыя ды праўдзівыя словы.

Што гэта так, мы добра пераканаліся на вопыце сваёй працы. Не хвалячыся, скажам, што працавалі ўсе ў калгасе за выключэннем адзінак па-ўдарнаму. Найвялікшым дасягненнем мы лічым тое, што карась нікога не прыходзілася за злосныя прагулы. Такіх не было. А ўжо калі каму ўздумаецца схавацца на суткі другога, каб лодыра пакорчыць, дык на заўтра звяно ўжо яго не прыме да сябе.

За добраякасную работу зямля аплаціла нам павышаным у параўнанні з мінулым годам ураджаем. Ячменю з аднаго га мы мае 12,16 цэнтн., пшаніцы — 9,64, аўса — 8,64 і жыта — 9,16.

Ад калгаснай МТФ мы маем звыш 13 тыс. руб. даходу.

Свае абавязкі перад дзяржавай па пастаўцы збожжа, бульбы, гародніны і інш. мы выканалі да тэрміна працуючы лепшай якасці.

На працадзень у нас прыпадае збожжавых 3,2 кгр. і бульбы 5,2 кгр., не лічачы кармоў для жывёлы, прошай і гародніны.

У нас праведзена вялікае будаўніцтва, на якое затрачана 3.722 працадні. Пабудаваны новы кароўнік на 100 галоў, майстэрня, свіран, даабсталяваны два навесы для с.-г. інвентара. Зараз проста такі люба паглядзець, калі ўсё па-гаспадарску на сваім месцы ўпарадкавана.

Мы задаволены сваімі вынікамі работы. Вось возьмем к прыкладу нашага 68-мігадовага старога **МЯЛЕШКУ ІСАНА.** За 10 месяцаў ён выпрацаваў 334 працадні, за што атрымлівае 62 пуды збожжа. Былы бядняк **ЮШКЕВІЧ ЕЛАДЗІМІР,** які раней заўсёды быў рад скарыстаць хлеба дырэдка меў яе, у калгасе за выпрацаваныя са сваёй сям'ёй 800 працадзён атрымлівае 160 пудоў збожжа і 260 пудоў бульбы.

Мы пішам вам, тав. Гікало, гэты ліст з калгаса, які знаходзіцца на адлегласці толькі 7 кілометраў ад граніцы, за якой нашы браты — працоўныя Заходняй Беларусі і Польшчы пакутуюць пад уціскам памешчыкаў і капіталістаў.

Мы, палякі і беларусы, аб'яднаныя ў калгасе «Штурмовец № 2», дружнай працай будуем заможнае культурнае жыццё. Нашы дзеці вучацца ў польскай і беларускай школах на сваіх родных мовах, выхоўваюцца ў духу пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Усякім малейшым імкненням напыяналнай варожасці, буржуазнага напыяналізма мы даем бязлітасны адпор, як праўленням класавага ворага, які часта выступае супроць соцыялістычнага будаўніцтва пад фальшыва-нацыянальным сцягам.

Мы разумеем, тав. Гікало, што наша прыгранічнае становішча вымагае асабліва высокай класавай пільнасці, надзвычай пільнай аховы соцыялістычнай маемасці. Таму ахову ў калгасных сёвірнах, ахову калгаснага дабра мы даручылі лепшым людзям з нашага калгаснага актыва.

Зараз у нас ідзе напружаная работа па завяршэнню гаспадарчага года. Мы ўключаемся ў агульны паход падрыхтоўкі да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда УсеКП(б) і бярэм на сябе наступныя абавязкі:

Да 15 снежня поўнасцю закончыць ссыпку насенных і страхавых фондаў лепшым збожжам. Склаці кармовы баланс і перадаць фуражныя фонды МТФ.

20 снежня закончыць размеркаванне калгасных даходаў па працадзнях.

Да 16 студзеня склаці вытворчы плян на 1934 год. Да 25 студзеня адрамантаваць асноўны с.-г. інвентар і вывезці на поле гной.

Конь наш патрабуе вялікіх клопатаў. Ён пры добрым і правільным догляде не баіцца працы. Каня мы шануем і гадуем жарабят. Сёлетніх 11 штук стаіць на стайні. Ужо зараз мы вылучылі асобна 35 жаробных матак і прызначаем іх толькі на лягчэйшую работу. Догляд коняй мы даверылі лепшым калгаснікам. Але гэтага мала. Трэба канчаткова і зараз-жа на прапягу 2-3 дзён ліквідаваць абазлічку коняй, замацаваўшы ўсіх за калгаснікамі. З гэтага-ж часу ўводзім абавязковую іх чыстку не менш аднаго разу ў дзень. З добрым кормам добра і ў поле, і ў дарозе.

Зараз як ніколі нам неабходны веды агра- і зоатэхнікі. Для аўладання гэтымі ведамі мы арганізуем гурток. Наш палітаддзел абяцаў для гэтай мэты прыслаць агранома. Мы ўпэўнены, што слова палітаддзела — цвёрдае слова, што сказана, тое і будзе зроблена. Трэба-ж зіму выкарыстаць для вучобы, каб на аснове навукі і тэхнікі лепш весці калгасную гаспадарку.

ЦО нашай партыі «Правда» ўводзіць на сваіх старонках усесаюзную чырвоную дошку імя XVII з'езда партыі. **МЫ УКЛЮЧАЕМСЯ Ў ВЫТВОРЧЫ ПАХОД, КАБ ЗАВАЯВАЦЬ ГОНАР БЫЦЬ ЗАНЕСЕНЫМІ НА УСЕСАЮЗНУЮ ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ ІМЯ XVII ПАРТЗ'ЕЗДА, КАБ ЗАВАЯВАЦЬ ГАНАРОВАЕ ПРАВА РАПАРТАВАЦЬ XV З'ЕЗДУ КП(б)Б.**

Горача вітаем вас, тав. Гікало, выпрабаванага большэвіка і кіраўніка КП(б)Б і ад душы жадаем вам добрага здароўя.

Па даручэнню агульнага схода ліст падпісалі:

Серак, Д. Досін Викат А. Вамадзінова Зноўкі Ф. Вікар Зварыно Уліця Гар. Дзмітрэй Ганчо Юшкевіч Я. Зноўкі Загорыка Кавалчук Камароўкоў Колца Ул. Сава Наўкоўскі П. Колдка Валодзь Валодка Шура Жукоўскі

Да суровай партыйнай і адміністрацыйнай адказнасці зрыўшчыкаў лесазагатовак і вывазкі

УПАЎНАРКАМЛЕС, ЦСПСБ І РАЁННЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ АБАВЯЗАНЫ НАКІРАВАЦЬ МАКСІМУМ СІЛ І ЭНЕРГІІ НА ВЫВАЗКУ І ДАСТАЎКУ АПАЛУ

ПРА ТОЕ, АБ ЧЫМ НЕ ГАВАРЫЛІ

Цэнтральны совет прафсаюзаў Беларусі рашыў на 10 снежня склікаць нараду гаспадарнікаў, ні вавых прафарганізацый па пытанню забеспячэння прамысловасці і транспорта насельніцтва палівам. Чаму менна 10-га, а не раней? Бяда толькі ў тым, што на нараду ўпаўнаркамлеса—**Розін**, дырэктар Лесбела—**Шаліра**, гартопа — **Астрахан**, Лесснабзбыта—**Красноў** не палічылі патрэбным з'явіцца.

Не судзіцца, як кажуць, было адбыцца нараде. Яе перанеслі на «неакрэслены» тэрмін. І ўсё гэта сведчыць аб тым, як асобныя гаспадарнікі лясной прамысловасці, прафсаюзаў «спяшаюцца» ажыцця вець пастановы партыі і ўрада ў справе палепшэння матэрыяльнага і культурна-бытавога становішча рабочых.

Адказныя работнікі апарата ЦСПСБ прымушаны зазначыць, чаму **менскі Зльвод**, завод **«Чырвоная зара»**, канцытарская фабрыка **«Комунарка»** і іншыя не атрымліваюць дастатковай колькасці палива. Не вопаюць яны аб тым, што райкомы саюза лесасплава, рабачкомы лесаўчасткаў у большасці сваёй бяздзейнічаюць.

Хіба-ж справай кіраўніцтва не павінен займацца апарат Цэнтральнага совета прафсаюзаў? Ён павінен і часамі займаецца. Але справа ў тым, што метады кіраўніцтва з'яўляюцца выключна канцылярскімі. Цыркуляры засланілі сабой аперацыйнае кіраўніцтва.

Само жыццё даказала, што мала напісаць і прыняць рэзалюцыю, а трэба яе выконваць. ЦП саюза лесасплава разнясе пастановы ЦСПСБ, рассылае іх райкомам і рабачкомам і па гэтым старшыня праўлення Альперын лічыць справу скончанай. Праверкі выканання няма.

Няма большэвіцкай барацьбы за планы загатовкі і вывазкі драўніны. Не было яе і ў часе лесасплава. Прафсаюзныя арганізацыі толькі надрукавалі з газет даведаліся аб тым, што на віне чынаўнікаў **Ка зімірскіча і Танхілевіча** замарожана **130 тыс.** кубаметраў драўніны.

Райкомы лесасплава, лесрабачкомы нічога не робяць у справе зніжэння сабекошта лесапрадукцыі. Сабекошт замест зніжэння за першых 9 месяцаў павялічан **на 17 проц.**

Што робяць прафсаюзныя арганізацыі Менска? Яны не здолелі дабіцца зніжэння платы на дастаўку дроў на заводы і кватэры рабочых і служачых. Калі шурка дроў каштуе **16 руб., то дастаўка з вакзала на Ленінскую вуліцу каштуе 50 руб.**

Кіраўніцтва Галоўпартранса карыстаецца момантам. Якую цану не «заломіць» за перавозку, спажыўцы прымушаны плаціць, толькі-б атрымаць дровы.

Мы сёння змяшчаем матэрыялы з месц, якія сігналізуюць аб поўнай бяздзейнасці асобных лесаўчасткаў лесрамгасаў. А там ёсць прафсаюзныя арганізацыі, якія дапамагаюць бяздзейнічаць гаспадарнікам. Старшыня Уздзенскага райкома саюза лесасплава—**Гурэвіч**—проста заявіў: **«Лесавывазкай галінны займацца гаспадарнікі, у прыватнасці, дырэктар Лазаковіч**, а мая справа абслугоўваць рабочых-лесарубаў».

Як думае Гурэвіч абслугоўваць лесарубаў—невядома. Вядома толькі, што ён на ўчастках ніколі не бывае, і што план за 1 снежня выкананы па вывазцы дроў толькі на **25,4 проц.**

Не лепш справа стаіць у **Віцебску, Гомелі, Шклове. Прафсаюзныя** арганізацыі гэтых лесрамгасаў не зрабілі і аднаго кроку наперад у справе практычнага ажыццяўлення апошніх пастаноў партыі і ўрада аб дровалесазагатоўках і вывазцы. У **Асіпавічах, Мазыры, Бабруйску** арганізацыі лесрамгасаў заняліся самастраховкай ад далейшых прарываў. Яны штодзённа пасылаюць тэлеграмы ў Лесбел, сігналізуючы аб тым, што **«аднаасобнік у лес не едзе, прыміце меры»**.

Аб якіх **«МЕРАХ»** людзі крычаць? Яны спадзяюцца на тое, што лесарубы і возчыкі прыпуць да іх з апарата Лесбела. Ніякай работы сярод аднаасобнікаў прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі лесрамгасаў не праводзяць.

Прафсаюзныя арганізацыі лясной прамысловасці прывыклі многа шумець, абвяшчаць джаздзкі штурма, стварыць штабы. Яны дагэтуль яшчэ не зразумелі таго, што пастановы ЦК і СНК **«аб заключэнні дагавораў з калгаснікамі і працоўнымі сялянамі-аднаасобнікамі на лесазагатоўку і вывазку драўніны»** даюць практычную праграму дзеяння па ліквідацыі леса загатоўчага прарыва. Неабходна толькі з большэвіцкай настойлівасцю змагацца за поўнае ажыццяўленне дырэктыў партыі і ўрада. У гэтай справе лесрамгасам павінны аказаць вялікую дапамогу прафсаюзныя арганізацыі і, у першую чаргу, ЦСПСБ, які кіруе ЦП саюза лесасплава, райкомамі і лесрабачкомамі.

Пытаннямі прафсаюзнай работы ў апаратах **Упаўнаркамлеса, Лесбела, Лесаснабзбыта** необходна сур'ёзна заняцца. Неабходна лясную прамысловасць прымусіць працаваць, як спраўны гадзіннік. Гэтага патрабуюць інтарэсы нашай абароны. Такія адносіны да работы лесрамгасаў, як былі да нарады (якая павінна была адбыцца 10 снежня), **павінны быць асуджаны.**

Лесрамгасы могуць і павінны выканаць заданне гэтага года — падрыхтаваць да выканання плана першага квартала 1934 года, у якім загатовіць не менш 80 проц. гадавога задання!

А. М.

ЦСПСБ АБАВЯЗАН ЗМАГАЦЦА ЗА АПАЛ

Пакончыць з пустазвонствам і пісанінай

У апошнія дні верасня, калі першыя халады настойліва напомнілі аб тым, што пара ўжо задумацца над пытаннем забеспячэння рабочых дровамі, ЦСПСБ вынес даволі гучную пастанову. Першыя радкі гэтай пастановы з усёй жорсткасцю абгрунтоўвалі па лесаснабжаючыя арганізацыі: «прапанаваць», «пад адказнасць», «у трохдзённы тэрмін» — карацей кажучы, не дрэнная пастанова, але яна не выканана.

Паколькі ЦСПСБ займаўся пытаннем снабжэння рабочых дровамі, трэба меркаваць, зразумела, **не па пастанове, а па рэальных рэзультатах.** Рэзультаты вядомы: Менск павінен быў атрымаць 120 тыс. рэўметраў дроў з такім разлікам, каб стварыць да 1 студзеня пэўны запас. Аб запасе гаварыць не прыходзіцца. Яго няма. Нават прадпрыемствы жывуць дзённымі запасамі палива. Рабочыя-пайшчыкі ў асноўным не снабжаюцца дровамі.

І вось, т. Гераўкеру — адказнаму за рабочае снабжэнне па ЦСПСБ — было задана зусім недвухсэнсоўнае пытанне: «Як-жа ЦСПСБ думае забяспечыць рабочых дровамі?» Ён затрудніўся на яго адказаць.

— Што-ж на вашаму трэба зрабіць, каб забяспечыць сталіцу палівам?

— Трэба, каб лесрамгасы добра працавалі.

А для таго, каб лесрамгасы добра працавалі...

І вось пачынаецца гісторыя «пра белага бычка». Адказны за снабжэнне дровамі па ЦСПСБ тав. Гераўкер наогул арыгінальна ўяўляе сабе барацьбу за снабжэнне рабочых дровамі.

— Прыдзецца склікаць нараду...

— Прымусіць даць транспарт...

— Паставіць на прэзідыум...

А разам з тым ці ведае ЦСПСБ аб перацыянальным выдаткаванні палива? Ці ведае Гераўкер аб тым, што і на менскай электрастанцыі, і на радзе іншых прадпрыемстваў перапал дасягае даволі вялікіх размераў.

— Не. Гэтым займаецца камітэт палива!

Так адказаў Гераўкер. **А, да рэчы, той-жа Гераўкер — член гэтага камітэта.**

Пакуль ЦСПСБ не займецца пасапраўднаму снабжэннем сталіцы дровамі, пакуль ён не адмовіцца ад цыркулярскіх металаў кіраўніцтва, цяжка чакаць, што самі лесрамгасы добра пачнуць працаваць...

У Менгарпрафсавеце справы некалькі іншыя. Тут сам старшыня гарпрафсовета тав. **Шулькін** і 19 брыгадзіраў сядзяць у лесрамгасах. Вакол пытання аб паливе, бывае, людзі працуюць. Але вынікі? Вынікі тыя самыя.

Нам, старшыні гарпрафсовета тав. **Саф'ян** у акружэнні ўласнікаў талонаў імкнецца вызначыць, хто ў першую чаргу павінен атрымаць дровы. Зразумела, што такі метад размеркавання дроў нікуды не годны.

Размеркаванне дроў арганізавала бясчынна. Гарпрафсовет не здолеў арганізаваць выдачу па рабочых калектывах. У ход пайшлі пісулькі, рэзалюцыі і тэлефонныя званкі...

Мітусня і адсутнасць усякага арганізуючага пачатка — вось што характэрна пры размеркаванні дроў сярод рабочых Менска. На рукі разадана звыш **15.000** талонаў. Задаволіць іх адразу гартоп не можа. Ясна, што гарпрафсовет і гартоп займаюцца не тым, чым трэба.

19 чалавек у лесрамгасах? Гэта лічба ўсё-ж прыпачная. Справа ў тым, што дровы ў прымацаваных да Менска лесрамгасах ёсць. Задача заключаецца толькі ў тым, каб напісуць на вываз да чыгункі і дабіцца падачы вагонаў. Гэтай асноўнай задачы не выконваюць гэтыя 19 чалавек. Рэальныя клопаты аб снабжэнні рабочых дровамі — гэта ліквідацыя іменна вузкіх месц вываза, гэта сапраўдная большэвіцкая арганізацыя работы.

Што-ж датычыць дапамогі рабочым у перавозцы ўжо атрыманых дроў, то тут таксама няма пэўнай стройнасці. Калі рабочы плаціць за шурку дроў **16 руб.**, то перавозка яму абыходзіцца ў тры, а часамі і ў чатыры разы больш. Толькі некаторыя прадпрыемствы арганізавалі дапамогу рабочым у вывазе сваім уласным транспартам. На многіх прадпрыемствах дырэкцыя не ідзе насустрач рабочым патрэбам. Разам з тым гарпрафсовет спецыяльна гэтым пытаннем не займаўся.

У дзейнасці як ЦСПСБ, так і менскага гарадскога прафсовета іс нуе імкнецце звалець усю віну за правал снабжэння рабочых дровамі на лясныя арганізацыі. Гэта жаданне трэба ў корані знішчыць. ЦСПСБ і менскі гарпрафсовет адказваюць за гэту справу ў першую чаргу.

Б. Р.

Кіруюць рэзалюцыямі

Віцебскі лесрамгас з месяца ў месяц павялічвае доўг перад крайнай. Заданне чацвертага квартала па 1 снежня па загатоўцы будаўнічай драўніны выкананае толькі на **26,6 проц.** дроў—на **4,6 проц.** Вывезена адзіведзка—**3,3 проц. і 10,9 проц.**

У чым прычына такога ганебнага прарыва? Яны заключаецца ў тым, што кіраўніцтва лесрамгаса не перастроіла сваёй работы ў адпаведнасці з пастановамі партыі і ўрада «аб вугольным Данбасе».

У выніку адсутнасці кіраўніцтва прарабскія ўчасткі зусім бяздзейнічаюць. Заместоўскі ўчастак (начальнік **Паталенка**) выжаўжуе сваё заданне па загатоўцы будаўнічай драўніны на 12 проц., дроў—на **1,9 проц.** Вывезена будаўнічай драўніны **1,7 проц.**, дроў—**3,4 проц.** Лосвінскі ўчастак (нач. **Звяркоў**) загатовіў будаўнічай драўніны **6,2 проц.**, дроў—**20,7 проц.**

Кіраўнікі гэтых участкаў апраўдваюць невыкананне плана адсутнасцю рабочай сілы і дапамогі з боку сельсоветаў. Самі нічога не робяць для таго, каб забяспечыць рабочых жыльмі шанцінкамі, наладзіць грамадскае харчаванне. Больш таго, рабочыя не атрымліваюць патрэбных інструментаў для работы ў лесе.

Спецыялісты сядзяць у кабінетах лесрамгаса. У лесе яны вельмі рэдкія госці. Кіраўнікі лесрамгаса пе ведаюць нават, колькі на ўчастках ёсць спецыялістаў.

Пастанову СНК СССР аб дагаворнай кампаніі з калгаснікамі і сялянамі—аднаасобнікамі пра леса загатоўкі і вывазку ў Віцебскім лесрамгасе толькі чыталі. Аб ёй пагаварылі, напісалі ўчасткам цыркуляры і на гэтым супакоіліся. У выніку замест **326** рабочых-лесарубаў працуюць толькі **77.**

Дайно закончан лесасплаў. Інжынерна-тэхнічны персанал сплаўканторы патрэбна было пераключыць на дапамогу ў лесазагатоўках. На справе ніякай дапамогі з боку сплаўканторы лесрамгас не атрымлівае. Загатоўкі ўчасткамі **Гуляевіч, Крывой, Баскін, Рабейчык, іх намеснікі Майсееў, Соркін, Лейзгольд адпушчаны ў адпачынак.**

Дырэктар Лесбела вельмі часта не ведае аб тым, што робяць яго намеснікі. Нядаўна трэст паў лесрамгасу заданне загатовіць **140** кубаметраў рушчотак. Следам за заданнем прыйшла паперка за подпісам намесніка дырэктара трэста **Песілева,** у якой ён прапановаў лесрамгасу адгрузіць **1.200** кубаметраў рушчотак. Як бачыце, паміж заданнем і прапановай «адгрузіць» ёсць вялікае разыходжанне. І ўсё гэта характарызуе канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва лесрамгасам.

Віцебскі лесрамгас пры дапамозе сплаўканторы і адказнымі кіраўніцтве трэста можа і павінен выканаць план лесазагатовак і вывазкі ў чацвертым квартале, які выратуе выкананне гадавой праграмы. Для гэтага ёсць усе магчымасці!

ЛЕЎ СТЭРНІН.

АБ НЕВЫКАНАННІ МЕНСКАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯЙ І БАРЫСАЎСКІМ ШКЛАЗАВОДАМ ІМЯ ДОМБАЛЯ ДЫРЭКТЫЎ АБ ЭКАНОМІІ ПАЛІВА

Пастанова Камісіі выканання пры СНК БССР

Заслухаўшы паклады прадстаўніка Менскай электрастанцыі (т. Пекеліс) і барысаўскага шклазавода імя Домбаля (т. Сашкоў) і сумаклад камітэта палива пры ЭКАСА БССР (т. Эгле) аб выкананні дырэктыў пра эканомію палива, Камісія выканання пры СНК БССР устанавляе, што:

а) Кіраўніцтва менскай электрастанцыі і шклазавода імя Домбаля не толькі не забяспечылі выканання дырэктыў аб зніжэнні ўдзельных норм выдаткавання палива на адзін кубометр прадукцыі на 10 проц. у параўнанні з мінулым годам, а, наадварот, дапусцілі значныя перапалы палива ў 1933 г., што сведчыць аб адсутнасці палівнай гаспадаркі на менскай электрастанцыі і шклазаводзе імя Домбаля;

б) кіраўніцтва Менскай ДЭС і шклазавода імя Домбаля амаль зусім не займаецца пытаннямі эканоміі палива і не прыняло своечасова патрэбных захадаў па палепшэнні якасці торфа на сваіх распрацоўках.

Палівныя склады знаходзяцца ў безгаспадарчым становішчы, торф з розных балот і з розным процантам вільготнасці складваецца ў адны штабелі, што не дае магчымасці манеўравання ў рацыянальным спальванні розных гатункаў торфа і паніжае яго каларыйнасць. Менская электрастанцыя, напрыклад, летам і восенню ў часы паралельна меншай нагрузкі спальвала лепшыя гатункі торфа (цвяноскі), а ў часе максімума вымушана працаваць на паливе з сялікай вільготнасцю.

Паратраводы дранна ізаляваны і прапускаюць пару (Менская ДЭС). Не распрацавана пытанне аб скарыстанні адыходзячых газаў для падсушкі палива, не ўстаноўлена кантроля за работай качагараў, вымяральныя прылады не скарыстоўваюцца і папсаваны, не распрацаваны канкрэтныя планы рацыяналізацыі лараслаўскай гаспадаркі;

в) энергагучэйкі на такаазных прадпрыемствах не працуюць, рабочыя, служачыя і ІТР не ўцягнуты ў барацьбу за эканомію палива і вакол гэтага пытання не праводзіцца ніякай масавай работы. Не мабілізуецца пралетарская грамадскасць.

Паказаныя недахопы ў вядзенні палівнай гаспадаркі Менскай ДЭС і шклазаводам імя Домбаля сведчаць аб тым, што прыкіраўнікі гэтых прадпрыемстваў недаацанілі ўсяго значэння эканоміі палива і тым самым ставяць над пагрозу не толькі нармальную работу сваіх прадпрыемстваў, але і спаб жэнне рабочых цэнтраў палівам;

г) камітэт палива пры ЭКАСА БССР слаба разгортвае работу па барацьбе за эканомію палива, не праводзіць абследаванняў прадпрыемстваў у галіне эканоміі палива і рацыяналізацыі імі палівнай гаспадаркі.

Камісія выканання пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Дырэктару Менскай электрастанцыі т. Сухаручкіну, дырэктару шклазавода імя Домбаля тав. Шульгіну за невыкананне дырэктывы партыі і ўрада аб 10-проц. эканоміі палива, за безгаспадарчае вядзенне палівнай гаспадаркі абвясціць вымову.

2. Абавязаць Менскую электрастанцыю, пад адказнасць т. Сухаручкіна, і шклазавод імя Домбаля, пад адказнасць т. Шульгіна, неадкладна прывесці ў парадак свае склады палива, забяспечыць сартаванне палива на складах з тым, каб стварыць магчымасць лёгкага манеўравання ў спальванні палива.

3. Прапанаваць дырэкцыі Менскай ДЭС неадкладна аглядзець усе паравароды, знічтожыць ушчэлку пары і палкам ізаляваць усе паравароды.

4. Абавязаць кіраўніка Менскай электрастанцыі, пад адказнасць тав. Сухаручкіна, і кіраўніцтва шклазавода імя Домбаля, пад адказнасць тав. Шульгіна, забяспечыць з 1 студзеня 1934 г. складанне квартальных палівных балансаў па сваіх калектывах з далейшым вызначэннем палівных страт і знішчэннем выяўленых недахопаў.

5. Абавязаць дырэктара менскай электрастанцыі т. Сухаручкіна і дырэктара шклазавода імя Домбаля т. Шульгіна адрамантаваць усе вымяральныя прылады і карыстацца імі ў штодзённай рабоце, забяспечыўшы інструктаж качагараў па ўжыванню вымяральных прылад.

6. Абавязаць трыкутнікі Менскай ДЭС і шклазавода імя Домбаля зараз жа па-сапраўднаму заняцца пытаннем эканоміі палива, прыцягваючы да гэтай работы шырокія колы рабочых, служачых і ІТР безумоўна да абушыся 10-проц. зніжэння выдаткавання палива на адзінку прадукцыі.

Папярэдзіць дырэктароў пакалных прадпрыемстваў і дырэктарыя ўсіх прадпрыемстваў БССР, што стаўленне эканоміі палива з'яўляецца з'ным з важнейшых пытанняў і ніякая ненармальнасць у вядзенні палівнай гаспадаркі і незабеспячэнне 10 проц. эканоміі палива будзе расцэньвацца Камісіяй выканання СНК БССР, як зрыў выканання дзяржаўнай дырэктывы партыі і ўрада.

7. Адзначаючы, што наркамам амаль зусім не займаюцца пытаннямі эканоміі палива прапанаваць ту прамысловым наркаматам БССР больш канкрэтна падыйсці да пытання эканоміі палива і рацыяналізацыі энергагаспадаркі, стварыць з усіх прадпрыемстваў энергагучэйкі, ажыццявіць працу існуючых, устанавіць пастаянны кантроль за выдаткаваннем палива сваімі прадпрыемствамі і прыцягнуць да адказнасці канкрэтных зрыўшчыкаў выканання дырэктыў аб эканоміі палива.

8. ЦСПСБ даць указанне па сваёй лініі аб разгортванні масавай работы сярод рабочых, служачых і ІТР па школ пытанняў эканоміі палива і рацыяналізацыі палівнай гаспадаркі, шырока практыкуючы заключэнне дагавораў на соцспаборніцтва паміж асобнымі прадпрыемствамі.

9. Прапанаваць інстытуту прамысловасці, пад адказнасць тав. Слоніма, неадкладна забяспечыць выданне масавай тэхнічнай літаратуры па пытаннях рацыянальнага вядзення палівнай гаспадаркі і шырокае разгортванне работы па абследаванні рацыяналізацыі палівнай гаспадаркі прадпрыемстваў БССР.

10. Даручыць пракурору рэспублікі тав. Кузьміну праверыць праходжанне справы ў менскай пракуратуры на работнікаў менскай электрастанцыі аб перапале палива і прычыны спынення гэтай справы.

Старшыня Камісіі выканання пры СНК БССР **М. ГАЛАДЗЕД.**

Сакратар Камісіі выканання пры СНК БССР **А. ЮРАШКЕВІЧ.**

БАЛБАТНЯ ЗАМЕСТ РАБОТЫ

УВАРАВІЧЫ. (Ад наш. кар.)

Старшыня уваравіцкага РВК тав. **Караленка** не адзін раз расп наўся на нарадах старшынь сельсоветаў і калгасаў аб вялікім значэнні лесазагатовак, лесавывазак. Але карысці ад гэтых гу ных прамоў мала. Што робіцца на мясцах?

На мясцах мы маем наступ нае: 9 сельсоветаў, прымацаваных да борхаўскага лесаўчастка, павін ны былі загатовіць **14.300** кубо драўніны і вывезці **25.150** кбм, а загатовілі толькі 6-8 проц.

Чабатовіцкі, Бацуцкі і Толь шоўскі сельсоветы не загатовілі не вывезлі ні аднаго кубаметра. Старшыня Теляшоўскага сельсовета **Тімаховіч** арыентуе калгаснікаў і аднаасобнікаў, на тое, каб яны не займаліся лесавывазкамі па сан най дарогі. Кулацкая зграя акапа лася ў Івальскім сельсавеце і пра водзіць там сваю падрыўную ра боту, накіраваную на зрыў лесо загатовак і лесавывазак. Сакрата гэтага сельсовета Бабакоў І. А рахункавод Вішнякоў (падчуваючы) свядома затрымалі на 10 дзе абавязацельствы па загатоўках вывазцы лесу.

Старшыня калгаса «Чырвоны Лоўкі» Гараеў заяўляе: «Толь таны дам коняй у лес, калі будуць маразы і выпадае снег».

Старшыня Івальскага сельсо та **Капельчук** і **Граеў** мала што самі нічога не робяць, яны прыкрываюць кулакоў **Чыко ва, Ісаева і Вішнякова.** Таму і не дзіва, што па Івальскаму сельсо вету па вывазцы замест **4.500** кбм. вывезена **217**, па загатоўках замест **2.350** кбм. нічога не загатоўлена.

Такія факты старшыня РВК тав. Караленка павінен быў ведаць. А гэта магчыма будзе толькі тады, калі людзі будуць займацца менш гаварыльняй, а больш справамі.

КАЗІМІРАЎ.

ЛЕСПРАМГАС ЗГУБІЎ РАБОЧУЮ СІЛУ

Уздзенскі лесрамгас на 1 снежня заданне чацвертага квартала па загатоўцы будаўнічай драўніны выканаў **на 19 проц.**, дроў — на **10 проц.** Вывезена будаўнічай драўніны **8,6 проц.**, дроў — **25,4 проц.**

У чым галоўная прычына адставання? Яна заключаецца перш за ўсё ў тым, што кіраўніцтва лесрамгаса (дырэктар **Лазаковіч**) нічога не зрабіла ў справе мабілізацыі калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў па лесазагатоўкі і вывазкі. Дагаворы з калгасамі заключаюцца па-старому, а не па пастаове апошніх пастаноў ЦК і СНК. Вытушчан з поля зроку аднаасобнік. У выніку з **262** лесарубаў працуе толькі **190**, возчыкаў замест **406** у лес выяжджае толькі **20.**

Лесрамгасы не рыхтаваліся да прыёма рабочых. Кватэры не адрамантаваны. У інтэрнатах участка **Курасоўшчына і Стапішча** (дзе жыве больш **50** чалавек) — грязь, няма пасцельных прылад. На ўчастку **ТАЗЫ** ў інтэрнаце (дзе жыве 18 рабочых) цёмна з-за адсутнасці ламп.

Усё гэта прывядзіць да цякучасці рабочай сілы. Ва ўласным транспарце не хапае лютвей. У выніку з **70** коняй непасрэдна занята на вывазцы толькі **25 проц.**

На ўчастках не праводзіцца культурна-выхаваўчая работа сярод лесарубаў. Райком саюза лясных рабочых (старшыня **Гурэвіч**) займаецца выключна збіраннем членскіх узносаў і складаннем планаў. Між тым планы культработы на IV квартал былі зацверджаны 12 кастрычніка, а на ўчасткі разасланы толькі **18 ЛІСТАПАДА.** Участковыя культработнікі — **Труханоўскі, Германовіч, Рамізевіч** і інш. таксама рэдка бываюць на ўчастках.

Якасць абедаў вельмі нізкая. На складах ОРС'а прадукты псуюцца. На ўчастку Пал'ямнае згніло 8 цэнт. проса. Хлеб прывозяць у сталоўку сыры. На складзе ў Негарэлым ляжыць 5 яшчыкаў макаронаў, якіх ніяк не могуць прывезці ў сталоўку.

У сельсоветах не вядзецца ніякай растлумачальнай работы па пытанню лесазагатовак. У калгасах не праведзена апошняя пастанова ЦК і СНК СССР «аб лесавывазцы і загатоўцы». У выніку калгасы паасобных сельсоветаў нават не прыступілі да лесавывазкі. Каменецкі сельсовет, які атрымаў заданне загатовіць будматэрыялаў **2.500** куб. метраў, дроў **300** кбм., не вывез ні аднаго кубаметра.

Уздзенскі лесрамгас з'яўляецца адным з асноўных участкаў у забеспячэнні Менска дровамі. Раённыя арганізацыі павінны разгарнуць шырокую масава-растлумачальную работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў, поўнасцю забяспечыць лесаўчасткі лесарубамі і возчыкамі.

ВАЛЬФСОН.

ПРЫВІТАННІ І-й УСЕБЕЛАРУСКАЙ ТЭАТРАЛЬНАЙ НАРАДЗЕ

Тав. В. Ю. ЖЭБРОЎСКІ

У дзень адкрыцця 1-ай усебеларускай нарады па тэатральна-відовішчных пытаннях горача вітаю работнікаў совецкага мастацтва БССР.

Толькі Кастрычніцкая рэволюцыя пад кіраўніцтвам ленінскай партыі дала магчымасць працоўным масам розных нацыянальнасцяй былой царскай Расіі будаваць сваю совецкую культуру нацыянальную па форме, социялістычную па зместу.

У БССР тэатральнае мастацтва, як частка совецкай культуры, у сувязі з індустрыялізацыяй краіны, социялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі, у сувязі з вялізарнейшымі поспехамі ва ўсіх галінах социялістычнага будаўніцтва, — вырасла ў магутную сілу ў руках пролетарыята за справу социялізма.

Дасягнутыя поспехі і задачы па далейшаму разгортванню социялістычнага будаўніцтва ў БССР рашуча патрабуюць ад работнікаў совецкага мастацтва ўзняць тэатральную справу на яшчэ большую вышыню, яшчэ большай і глыбейшай сувязі з працоўнымі масамі, вывучэння вопыта социялістычнага будаўніцтва, усямернага разгортвання работы па вывучэнню класікаў марксізма — Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, каб у сапраўдных мастацкіх вобразах адлюстраваць упартую, напружаную барацьбу працоўных за комунізм, за совецкую культуру—нацыянальную па форме, социялістычную па зместу.

Работнікі тэатральнага фронта ў БССР павінны ў нацыянальных формах мастацтва адлюстроўваць вопыт пролетарскага інтэрнацыянальнага руха за суседную пролетарскую дыктатуру, практыку социялістычнага будаўніцтва ў СССР. БССР, усямерна ўмацоўваючы пролетарскае інтэрнацыянальнае адзінства працоўных усіх нацыянальнасцяй, бязлітасна вядучы барацьбу ў нацыянальным пытанні на два фронты—супроць вялікарускага шовінізма, як галоўнай небяспекі ў маштабе ўсяго СССР і ўсёй УсеКП(б) і супроць беларускага нацыяналізма, як галоўнай небяспекі ў БССР у даны момант социялістычнага будаўніцтва; разам з гэтым неабходна ўзмацніць барацьбу супроць іншых мясцовых шавінізмаў і нацыяналізма.

Вашай нарадзе прадстаіць вырашыць рад практычных пытанняў, выцякаючых з творчых задач совецкага тэатральнага будаўніцтва. Барацьба за высокую ідэйную якасць прадукцыі, за паказ героя пяцігодкі, за крытычнае аўладанне культурнай спадчынай, за праўдзівае адлюстраванне метадам социялістычнага рэалізма працэсаў індустрыялізацыі і калектывізацыі нашай краіны, барацьба супроць буржуазна-фармалістычных і «лявацкіх» спрашчэнскіх установак, за адзінства социялістычнага зместа і нацыянальнай формы совецкага тэатральнага мастацтва—вось рад неадкладных задач, стаячых перад вамі. Толькі ў дружнай таварыскай рабоце з іншымі атрадамі совецкага мастацтва, у непарыўнай сувязі з тэатрамі ўсяго СССР, слядуючы ўказанням комуністычнай партыі аб стварэнні магнітабудаў мастацтва і пад яе кіраўніцтвам вы дасягнеце далейшых поспехаў.

Упэўнен, што нарада і тэатры БССР спраўляцца з пастаўленымі перад імі задачамі, што нарада паслужыць сродкам мабілізацыі ўсіх работнікаў совецкага мастацтва за павышэнне якасці тэатральнай прадукцыі і ўзмацненне ролі гэтага мастацтва ў барацьбе за задачы другой пяцігодкі.

Сакратар ЦК КП(б)Б ЖЭБРОЎСКІ.

Тав. М. М. ГАЛАДЗЕД

Ад Совета Народных Камісараў Беларускай ССР шлю гарачае прывітанне працаўнікам совецкага мастацтва БССР у сувязі са скліканнем першай усебеларускай нарады па тэатральна-відовішчных пытаннях.

Комуністычная партыя і совецкая ўлада аддаюць сур'ёзную ўвагу пытанням мастацтва, ведаючы, што мастацтва ў руках пролетарскай дзяржавы служыць магутнай зброяй выхавання мас на прынцыпах сапраўднага пролетарскага інтэрнацыяналізма, у духу комунізма.

У барацьбе за мастацтва нацыянальнае па форме і социялістычнае па зместу, у БССР дасягнуты вялікія поспехі. Гэтыя поспехі могуць адмаўляць толькі нашы ворагі. Аграмадныя дасягненні ў галіне развіцця совецкага тэатра ў БССР. Усё гэта дасягнута ў жорсткай класавай барацьбе, асабліва ў барацьбе з контр-рэволюцыйным нацдэмакратызмам і вялікадзяржаўным шавінізмам.

Задача нарады заключаецца не толькі ў тым, каб замацаваць дасягнутыя поспехі, але і ў тым, каб вызначыць бліжэйшыя задачы з тым, каб узняць справу тэатра і відовішчаў яшчэ не большую ідэйна-якасную ступень, з тым, каб зрабіць тэатры ўзорам социялістычнай культуры і разумнага адпачынку, вытрушчаць з іх элементы халтурышчыны, безгаспадарчасці і недысцыплінаванасці, яшчэ больш наблізіць іх да мас і зрабіць іх сапраўднай кузняй мастацкай культуры і надзейнымі праваднікамі ідэй партыі, сродкам барацьбы за практычныя задачы совецкай улады і соц. будаўніцтва.

У вашай рабоце асабліва важную ролю (рашаючую) адыгрывае рэпертуар, тэму барацьба за сапраўды социялістычную п'есу, за высока мастацкае аформленне — гэта пярвейшая ваша задача. Не рас кідайцеся, не ганіцеся за колькасцю пастановак, выбярыце і стварыце лепшыя ўзоры, але ўзніміце іх на найвышэйшы культурны, ідэйны і мастацкі ўзровень, аўладайце мастацтвам як мага лепш і тады поспехі любога калектыва артыстаў, а значыць і тэатра ў цэлым будуць напэўна забяспечаны.

Заклікаю нараду весці сваю работу пад знакам завастрэння пролетарскай класавай пільнасці. Рэшткі классава-варожых сіл актывізуюцца перад тварам сваёй пагібелі. Трэба моцна помніць, што вялікадзяржаўны шавінізм з'яўляецца галоўнай небяспекай у маштабе СССР, але гэта не супярэчыць таму, што мясцовы беларускі нацыянал-дэмакратызм і шавінізм, змыкаючыйся з капіталістычнымі інтэрвентамі, ва ўмовах БССР з'яўляецца асноўнай небяспекай на даным этапе. Змагай цеся з гэтымі ворагамі, якія з'яўляюцца саюзнікамі міжнароднага імперыялізма, змагайцеся за асноўныя прынцыпы пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Жадаю поспехаў у вашай рабоце. Пад сцягам Леніна—Сталіна мацуйце пазіцыі социялістычнай культуры!

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

СУСТРЭЦЬ З'ЕЗДЫ ПАРТЫІ НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ КАЛГАСНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ

Случчына павінна ператварыць свае малочна-таварныя і свінагадоўчыя фермы ў соцыялістычныя фабрыкі мяса, сала, малака і масла

Свінарка ГУРЛЕНЯ МАРЫЯ — лепшая ўдарніца свінафермы калгаса «СЛУЧ № 2». За ўвесь год работы на ферме ў яе не было ні аднаго выпадка адыхода парасят, якіх яна даглядае. На здымку 13 парасят, свіна-маткі злучанай з ангельскім кнырам. Гурлеяя дабілася поўнага захавання ўсяго памёта.

Стварыць высокапрадукцыйную жывёлагадоўлю

У сваёй гутарцы з калгаснікамі Случчыны тав. Сталін асаблівую увагу звярнуў на разбіццё калгас і жывёлагадоўлі.

Высокі ўраджай гэтага года дае велізарныя магчымасці забеспячэння паспяховага росту соцыялістычнай жывёлагадоўлі. У гэтым участку багацейшыя магчымасці мае ўся БССР і ў першую чаргу буйнейшы жывёлагадоўчы раён рэспублікі—Случчына.

У адных толькі малочна-таварных фермах Случчыны стаіць 2000 галоў жывёлы. У калгасных свінатаварных фермах стаіць 8.235 свіней, у тым ліку 1.851 матка.

Ёсць у раёне багатая кармавая база не толькі для забеспячэння наяўнага пагалоўя, але і для павялічэння колькасці кароў і свіней. Случчына засявае 12.700 га бульбы, якія сёлета далі ад 600 да 700 пудоў з га. Сярэднюю ўраджайнасць бульбы па раёну лёгка можна давесці да 1.000 пудоў пры правядзенні мінімальных агранамічных мерапрыемстваў.

Мясная частка раёна, лугі і сенажаці поўнасцю забеспячваюць пагалоўе раёна пашай і грубымі кормамі.

Пры правільным кіраўніцтве жывёлагадоўлі Случчына можа дабіць свае малочныя і свіна-таварныя фермы магутнай крыніцай забеспячэння мясам, малаком і салам рабочых горада, магутнай крыніцай для павышэння заможнасці кожнага калгасніка.

Узорныя вынікі работы паказваюць фермы калгасаў «Чырвоная Вясея», імя Розы Люксембург, 1 мая і інш. Аб гэтым сёння ў газеце расказвае парторг калгаса «Чырвоная Вясея» тав. **КУЛАБЫШЭЎ МІКОЛА**, які дабіўся высокіх вынікаў праз арганізацыю правільнага плаканання на ферме. Аб гэтым гаворыць брыгадзір свінафермы калгаса імя Розы Люксембург т. **КУКЛІЦКАЯ АЛЕСЯ**, якая дабілася поўнай ліквідацыі адыходаў на ферме. Аб гэтым сведчыць калгас імя 1 мая, які дабіўся павялічэння ўдойлівасці на сваёй малочна-таварнай ферме ад 800 літраў на карову ў 1932 г. да 1.200 літраў у 1933 г.

Але вопыт і дасягненні перадавых не зрабіліся здабыткам усіх калгасаў раёна. Багацейшыя магчымасці не выкарыстоўваюцца. Звыш 3.000 парасят і свіней загінулі сёлета на СТФ Случчыны. Каля 2 млн. руб. страцілі калгаснікі Случчыны ў выніку безгаспадарчага, няўмелага, а часам і шкодніцкага кіраўніцтва жывёлагадоўляй, галоўным чынам свінагадоўляй.

Без усякага кіраўніцтва пакінуў гэту справу Наркамзем, які, абмежаваўшыся ролью чабочнага наглядальніка.

Перад тварам 17 з'езда УсеКП(б) і 15 з'езда КП(б)Б буйнейшы жывёлагадоўчы раён БССР—Случчына, павінен паставіць перад сабой адказную задачу —**СТАЦЬ САПРАЎДНАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ФАБРЫКАЙ МЯСА, САЛА, МАЛАКА І МАСЛА.** На вырашэнне гэтай задачы трэба ўзняць усю партарганізацыю, увесь совецкі і калгасны актыў, усіх калгаснікаў і калгасніц раёна.

У зоне сваёй дзейнасці на чале барацьбы за соцыялістычную жывёлагадоўлю павінен стаць палітаддзел. Падрабязна ўвайсці ва ўсе дэталі працы на фермах, дабіцца ліквідацыі адхода маладняка і бесперапыннага роста і аднаўлення пагалоўя—вось за што павінен змагацца палітаддзел МТС.

Становішча на фермах, галоўным чынам свінагадоўчых, у першую чаргу залежыць ад свінарак, ад жанчын-калгасніц. Багацейшы вопыт жанчын у доглядзе за жывёлай. іх любоў да каровы і свіні трэба перанесці ў калгасныя фермы. У барацьбе за рэнтабельную жывёлагадоўчую гаспадарку —цэнтральнае месца жанчыны-калгасніцы.

На заклік свінаркі Куклідкай Алесі аб сістэматычнай зоатэхнічкай вучобе для свінарак усе калгасы павінны адказаць арганізацыяй зоатэхнічных і ветэрынарных гурткоў на ўсіх СТФ і МТФ раёна.

17 з'езд УсеКП(б) і 15 з'езд КП(б)Б Случчына павінна сустрэць рашучай перастройкай кіраўніцтва жывёлагадоўлі, канкрэтнымі справамі і дасягненнямі ў барацьбе за першае месца ў БССР на гэтым адказнейшым участку.

ВЫТВОРЧЫ ПЛАН—АСНОВА РАБОТЫ

Вось уявіце сабе такую рэч. Па буцавалі сёлета ў калгасе «Чырвоныя горкі», Сорагаўскага сельсавета, новую стайню. Кінуліся туды, сюды, няма дзе пакласць. А стайня гатова. Не паставіць-жа коняй у незашклянную стайню!

Думалі калгаснікі, разважалі, нішкай рады няма. Тады падымаецца на сходзе стары дзед ды кажа:

— Таварышы, знаюць думаю я, што ніякага граха не будзе, калі мы з абразоў нашых пакладзем і стайню зашклім... Коняй на весняную сяўбу ў цяпле захаваем, а абразам як-небудзь у хаце і ток цёплы будзе...

І аднадушна ўхвалілі — багоў разашклілі, а пакло на стайню перадаць. Так і зрабілі.

Безумоўна, лягчэй працаваць у калгасе стала. Зразумелі калгаснікі што да чаго. Вось, скажам, план. Цураліся раней яго калгаснікі: «Навошта ён нам, век свой без плана пражылі». А потым агледзеліся, што калгас—гэта табе не аднаасобная гаспадарка. У калгасе, як сказаў тав. Сталін, без плана не абыйдзешся.

— Канкрэтна ведаць за што змагацца,—у гэтым асноўны змест усёй нашай работы. Так я і раблю.

Наша свінагадоўчая ферма мае падрабязна складзены гадавы вытворчы план. З яго складаецца план на кожны месяц, для кожнай брыгады. На штомесячных шырокіх вытворчых нарадах мы яго абгаварваем і даводзім да кожнай дагляднцы.

Вось, напрыклад, у кастрычніку ферма мела такі план: злучыць ва тыры маткі, атрымаць шэсць апаросаў не менш шасці парасят ад кожнага. Адняць ад матак дванаццаць сасуноў, здаць дзяржаве 4,5 цэнтн. мяса, дабіцца прыросту маладняка старэй чатырох месяцаў —15 кіло.

Кожная даглядчыца дакладна ведала, што і як ёй трэба рабіць для таго, каб план быў выканан. А ў выніку, калі мы ў пачатку лістапада падагулілі выкананне плана за кастрычнік, то выявілася: **план злучкі выкананы на 100 проц., было 6 апаросаў (39 парасят), аднята ад матак 17 сасуноў, выкананы план мясаздачы. Прырост жывой вагі падсвінкаў замест 15 кіло складае 20.**

Мне ўдалося дабіцца таго, што вытворчы план укараніўся ў штодзённае жыццё фермы, пачынаючы ад загадчыка і канчаючы даглядчыцамі. З месяца ў месяц кожная даглядчыца ведае якіх паказчыкаў яна павінна дабіцца і колькі за гэта атрымае працадзён.

Так, напрыклад, у даглядчыцы-ударніцы **Карцель Мані за кастрычнік не загінула ні адно парася** — атрымала яна 39 працадзён. **Ганчарык Палашка**, таксама захавала ўвесь прыплод, але аграмы гэтага прывес жывой вагі падсвінкаў у яе вышэйшы чым у Карцель Мані, таму яна атрымала 41 працадзень. У **Бярэзенкі Фядоры** загінула трое парасят і атрымала яна толькі 30 працадзён.

Брыгады і свінаркі між сабой заўсёды спаборнічаюць. На ферме, як правіла, нармальная тэмпература, чыста, свінні кормяцца па гадзіннику. Рацыён складаецца для кожнага віда свіней асобна.

Халастая матка ў часе стойлівага перыяда атрымлівае штодзень грубых кормаў (мякіны) 0,5 кіло, канцэнтратаў — 0,5 кіло, бульбы—3 кіло, сіласа—1 кіло. Суяросная матка атрымлівае мякіны 0,5 кіло, канцэнтратаў—0,9 кіло, бульбы—4 кіло, адгона—5 літраў. Падсосная матка атрымлівае мякіны 0,5 кіло, канцэнтратаў — 1,5 кіло, бульбы—4 кіло, адгона—10 літраў. Такім чынам кожная свіння атрымлівае кожны дзень тое, што ёй належыць па загадзя вызначанаму плану.

План камплектавання стада за гэты год фермай выканан. Ёсць 161 свіння, у тым ліку 43 маткі. План здачы мяса калгас таксама выканаў. У парадку падрыхтоўкі да 17 з'езда УсеКП(б) ферма абавязалася выканаць план здачы мяса за першы квартал 1934 года на 25 студзеня.

Ферма дала калгасу чыстага даходу 10.000 руб. На будучы год мы пастойліва дабіваемся павялічыць даход ад свінафермы ў пры разы.

Кожны дзень тут-жа ў свінарніку адну гадзіну адраем мы вазтэхнічнай вучобе. Вельмі часта праводзім тутаркі на палітычныя тэмы. Свінаркі выпісваюць газеты, чытаем мы іх у голас і абгаварваем пры актыўным удзеле ўсіх прысутных. Акуратна выпускаем мы насценную газету.

Наш калгас ініцыятарам усебеларускага паходу за высокакласную жывёлагадоўлю. Трэба сказаць, што дагэтуль мы гэтыя на сябе абавязкі выконваем акуратна. Зараз, у часе падрыхтоўкі да 17 з'езда партыі, мы яшчэ больш узмоцнім нашу барацьбу за тое, каб вытворчы план СТФ выконвалі нашы не горш, чым прамфінплан на любым соцыялістычным прадпрыемстве.

КУЛАБЫШАЎ МІКОЛА.

Парторг СТФ калгаса «Чырвоная Вясея» (Случчына).

Матэрыял арганізован брыгадай „Звязды"
Л. Капланам
М. Вішнеўскім

Свінарка ПАЛАЗНІК ЕВА—лепшая ўдарніца свінафермы калгаса «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ». Ферма поўнасцю забяспечана кармамі, добра падрыхтавалася да зімы.

НА ФЕРМУ ПРЫШОЎ ПАРТОРГ

За летні час у нашай свінаферме быў вялікі падсек парасят. Гэта з'явілася ў выніку таго, што мы ніяк не змаглі як след наладзіць арганізацыю працы на ферме.

Становішча рэзка змянілася, калі ў верасні на ферму прыйшоў парторг тав. **Ельніцкі Пятро.** На комсамольскім сходзе разам з усімі свінаркамі абгаварылі мы пытанне аб пераводзе аплаты працы на адзельнічыну. Да гэтага часу свінаркам у працоўныя кніжкі ставілі толькі палачку. Ніякіх страт ад падсежа свіней, ад дрэннага догляду за пагалоўем мы не неслі. За свае працадні мы былі спакойны, бо і ніякіх захадаў для палепшэння догляда свіней мы не рабілі. У свінарніках было брудна.

На гэтым сходзе парторг растлумачыў нам усю шкодласць такой сістэмы арганізацыі работы. Ацэнталосна выказаліся мы за пераход на адзельнічыну. Стварылі мы дзве брыгады. На чале першай стала брыгадзірам старэйшая свінарка **Цэльнер Раіна**, якая працуе на ферме з пачатку яе заснавання. На чале другой стала я.

Работа ажывілася. Дзве брыгады пачалі спаборнічаць на лепшы догляд свіней, захаванне маладняка, чыстату ў свінарніках і падрыхтоўку да зімы.

Гэта адразу адбілася на росце пагалоўя. Цяпер СТФ зусім не мае адыходаў. З 39 асенніх апаросаў захаваны ўсе парасяты. Ферма налічвае цяпер 162 галоў свіней, з іх 50 свінаматак, што складае 100 проц. плана камплектавання. План мясаздачы выканан.

Праўда, трэба прызнацца, што справа ўвядзення адзельнічыны на свінаферме яшчэ не даведзена у нас да канца.

Часта бывае на ферме парторг. Заглядае ў хлявы, ці пазатыканы ўсе шчыліны, ці правільна складаецца рацыён, ці добра даглядаюцца свінні. Тут-жа заўважае, што і дзе трэба выправіць.

Спецыяльна для свінафермы атрымліваем мы газеты і журналы. Але, на жаль, не наладжана штодзённая чытка гэтых газет на ферме са свінаркамі. Баючыся каб газеты не скурылі, мы іх акуратна хаваем, але чытаць мала хто з нас чытае. А гэта, безумоўна, шкода.

Мала хто з нашых свінарак вучыцца. Ёсць сярод нас і малаграматныя. За з'ездовы час мы гэтую справу абавязкова ўпарадкуем. Усе свінаркі будуць вучыцца ў зоатэхнічным гуртку, бо без гэтых ведаў на свінаферме працаваць нельга.

У часе ўсебеларускага і ўсесаюзнага з'ездаў партыі, а таксама і пасля іх мы думаем на ферме наладзіць чытку і абгаварэнне ўсіх матэрыялаў з'езда. Свінаркі з гэтым пытаннем ужо звярталіся да парторга. Наогул сярод нас, як і ўсіх калгаснік, ёсць прагнае жаданне да палітычнай вучобы, хочам ведаць усё пра вакольнае жыццё, а таксама і пра ўсе мерапрыемствы партыі і ўрада.

КУКЛІЦКАЯ АЛЕСЯ

Брыгадзір 2-й брыгады СТФ калгаса імя «Розы Люксембург» (Случчына.)

ФЕРМЫ НА КАЛЁСАХ

Калгас ёсць буйная гаспадарка. Такую гаспадарку нельга вести без плана. Буйная гаспадарка патрабуе, ахапляючая сотнямі і тысячы двароў, можа весціся толькі ў парадку планавага кіраўніцтва. Без гэтага яна абавіна загінуць і разваліцца».

Гэтыя ўказанні правадыра партыі тав. Сталіна ў яго гістарычнай прамове аб рабоце ў вёсцы на сучасным этапе асаблівую актуальнасць маюць, калі мы шчыльна падыходзім да вырашэння праблемы жывёлагадоўлі.

На радзе фактаў няправільнага кіравання і адсутнасці ўсякага кіраўніцтва жывёлагадоўляй на Случчыне мы хочам паказаць, да чаго прыводзіць ігнараванне ўказанняў тав. Сталіна.

ІНІ ВАНДРУЮЦЬ

Пры эканамічнай спецыялізацыі Ленінскага раёна **Ленінскі** сельсавет вызначаўся як жывёлагадоўчы. Старчальнай кармовай базы для малочных таварных ферм у сельсавеце няма — сельсавет бязлесны, сенажацяй, выпасаў, таксама няма. Тым не менш, у калгасах сельсавета густа насаджваліся малочныя фермы, хоць шмат якія калгасы настойліва дабіваліся, каб у іх асноўным відам гаспадаркі былі свінагадоўчыя фермы, а МТФ — дапаможнымі.

Ледзь не круглы год стаяць у дворах каровы МТФ, калгаса **«Воля праца»**. Навокал няма лясоў, няма выпасаў. Але калгас мае магчымасць арганізаваць рэнтабельную свінагадоўчую гаспадарку. На свінагадоўчай ферме калгаса стаяць 109 свіней, у тым ліку 18 свінаматак. Калгас мае 537 га ралі і мае магчымасць больш чым падвоіць колькасць свінаматак на СТФ.

Праўленне калгаса гэтае пытанне некалькі разоў узнімала перад раённымі арганізацыямі, зварачалася ў райземадзел, у райжывёлааб'яднанне — ніхто ўвагі на гэта не звяртаў. Більш таго, калгас прымушалі пашыраць МТФ, не даючы яму магчымасці павялічыць колькасць свінапагалоўя.

Адваротнае становішча ў **Палікарпаўскім** сельсавеце, якога раённыя арганізацыі спецыялізавалі ў свінагадоўчым напрамку. У гэтым сельсавеце з вялікай плошчай лясоў і выпасаў ёсць усе ўмовы для рэнтабельнай малочна-таварнай гаспадаркі, для якой свінагадоўля была-б толькі дапаможнай галіной.

Возьмем калгас **імя Сталіна,** які знаходзіцца ў раёне лясоў, балот багатых сенажацяй. На тэрыторыі калгаса ёсць і бровар,з якога можна браць брагу для добрых некалькіх соцень кароў. Але калгасу райжывёлааб'яднанне навязвала свінаферму замест разгортвання малочнай гаспадаркі.

Калгас **імя Сталіна,** Серадзінкоўскага сельсавета, пры высокай ураджайнасці бульбы і збожжа мае ўсе магчымасці паставіць свінаводчую рэнтабельную гаспадарку. Тым не менш калгасу запланавалі толькі адну коняводчую ферму.

Падобная спецыялізацыя сельскай гаспадаркі была дапушчана не толькі да Ленінскага і Палікарпаўскага сельсветаў. Тое самае рабілася і ў радзе калгасаў Белідкага, Амгавіцкага, Соргаўскага сельсветаў, спецыялізацыя якіх не адпавядала іх эканамічным асаблівасцям і становішчу таго ці іншага калгаса.

Гэта прывяло да стварэння так званых ферм на калёсах, да перасоўвання свіней з года ў год з калгаса ў калгас. Гэта мела месца ў калгасах «КІМ», «Случ № 2», «Комінтэрн», «Совецкая Беларусь» і ў радзе іншых.



Абора, сіласная вежа і стада інтэрнацыянальнага калгаса «1-га МАЯ». Замест сярэдняй удойлівасці ў 800 літраў з каровы ў 1932 годзе калгаснікі сёлета дабіліся павялічэння ўдоя да 1.200 літраў.

У раёне стала агульнай з'яваў, што свіні пераводзіцца з Палікарпаўскага сельсавета ў Амгавіцкі, з Амгавіцкага ў Старэўскі і г. д. Напрыклад, летась восенню з калгасаў Палікарпаўскага сельсавета перавялі свінапагалоўе ў калгас «КІМ», Амгавіцкага сельсавета. Сёлета з гэтага самага калгаса пагалоўе перакінулі ў Ісарэнскі сельсавет. Класавы вораг выкарыстоўваў гэтую чэхарду для разбазарвання і раскрадання калгасных кароў і свіней.

Слуцкі райком партыі і райвыканком жывёлагадоўляй па сутнасці зусім не кіравалі, здалі ўсю гэтую справу ў аренду райземадзелу, райжывёлааб'яднанню і тым самым далі магчымасць засеўшым там шкодніцкім элементам зрываць аднаўленне калгаснага пагалоўя, падрываць базу свінагадоўлі.

„ЗАКОННАЕ" РАЗБАЗАРВАННЕ ФЕРМ

Апартуністычнае штампаванне райвыканкомам практыкі райземадзела асабліва моцна ўдарыла па калгаснай жывёлагадоўлі пасля зацвярджэння сустрэчных планаў мясаздачы.

Сустрэчныя перапавялічаныя планы прывялі да таго, што мясаздачы стаўкі выконваліся за лік свінаматак. Калгас **«Прагрэс № 2»**, маючы толькі 39 свінаматак, атрымаў план мясаздачы на 55.

Калгасу імя Сталіна, Уроцкага сельсавета, пры наяўнасці 24 матак далі план мясаздачы на 45, калгасу «Чырвоныя горкі», Сорагаўскага сельсавета, пры наяўнасці 55 матак далі план мясаздачы на 75.

Быў нават выпадак, калі калгас адвозіў у лік мясаздачы парасную матку, якая ў дарозе прыняла 12 парасят. Увесь памёт у дарозе загінуў, матку прышлося прырэзаць.

ЗАГІНУЛА ЗВЫШ ТРЭЦІ ПРЫПЛОДА

Варта было-б толькі заглянуць на фермы, каб убачыць у станках бруд, антысанітарыю, адсутнасць усякага догляда за маладняком, адсутнасць зоатэхнічных правіл. У выніку ў раёне загінула звыш трэцяй часткі сёлетняга прыплода. У паасобных калгасах гібель парасят даходзіла да 60-70 проц. апароса. Гадавы план камплектавання свінапагалоўя выкананы раёнам толькі на 57 проц.

Гэта рабілася на вачах усёй партарганізацыі, раённага партактыва, які будучы ледзь не круглы год у калгасах — на сяўбе, уборцы, загатоўках, павінен быў заўважыць усе гэтыя абуральныя факты. Незаўважалася гэта толькі таму, што на жывёлагадоўлю наогул ніхто сур'ёзнай увагі не звяртаў, што будучы ў калгасах ніхто з раённых працаўнікоў на фермы не заглядваў, іх працай не цікавіўся.

ШТАМПОЎШЧЫКІ ПЛАНАЎ

Паводле плана Наркамзема БССР да канца 1933 года ў Случчыне павінна быць арганізавана 45 МТФ. Па зводках райземадзела ў раёне зараз 132 МТФ. Калі мы пацікавіліся, адкуль у раёне такая вялікая колькасць МТФ, аказалася, што сюды ўваходзяць такія «фермы», як калгаса «Магутны», дзе ёсць 3 каровы, калгаса «Будаўнік» — 2 каровы, калгаса «Іскра» — 1 карова і шмат падобных.

Не лепшай аказалася статыстыка па СТФ, якіх па вестках у раёне 128. У сапраўднасці сюды ўваходзіць таксама 24 «фермы», у якіх няма ні адной свінаматкі.

Ці павінны былі ведаць аб гэтай куланцкай арыфметыцы Наркамзем і беларускае аб'яднанне жывёлагадоўчых ферм. Безумоўна павінны былі. Але яны проста штампавалі лутыя хлуслівыя зводкі аб становішчы жывёлагадоўлі ў раёне.

Не маючы ніякага ўяўлення аб сапраўдным становішчы на мясцах, Наркамзем пры планаванні жывёлагадоўлі проста выдумляў лічбы. 11 лютага Наркамзем прыслаў Случку план на давядзенне к канцу года пагалоўя свіней да 12.700 шт. у тым ліку 3.700 матак. У красавіку прысылаецца новы, «выпраўлены» план на 13.170 свіней, у тым ліку матак 3.120. 29 ліпеня Случчына атрымлівае трэці план — колькасць свінаматак памяншаецца да 2.700, а колькасць усяго пагалоўя... павялічваецца да 14.300.

***

На працягу апошніх месяцаў, калі па ініцыятыве **«Звязды»** Случчына пачала паход за высокакласную жывёлагадоўлю, раённыя арганізацыі ўпярыбыню сур'ёзна падышлі да перастройкі кіраўніцтва жывёлагадоўляй. У раёне быў праведзен дэкадник, а пасля месячнік падрыхтоўкі стада да зімоўкі.

Але гэта яшчэ не ўсё. Раённая партарганізацыя яшчэ мала зрабіла для правільнай арганізацыі справы кіраўніцтва жывёлагадоўляй. На жаль, у случкім РК і РВК не ўсе яшчэ разумеюць, што пытанне жывёлагадоўлі з'яўляецца цэнтральнай праблемай для раёна.

У раёне няма яшчэ сапраўднай перастройкі работы на гэтым адказнейшым участку. Трэба рашучэй пакончыць з тым ненармальным становішчам, калі земадзел, маючы ўсе правы, не нясе за жывёлагадоўлю ніякай адказнасці, а райжывёлааб'яднанне, на якое ўскладзена ўся адказнасць, не мае ніякіх правоў. РЖКА, як непатрэбная інстанцыя, павінна быць ліквідавана.

Рэчаіснасць настойліва патрабуе перадачы ўсёй справы жывёлагадоўлі ў зоне дзейнасці МТС пад непасрэднае кіраўніцтва МТС, якая-б адказвала за жывёлагадоўлю, таксама як і за выкананне ўсіх с.-г. работ у сваіх калгасах.

Наркамзем павінен пакончыць з практыкай штампавання зводак, блытаніны і старэннага наглядання за вырашэннем праблемы жывёлагадоўлі, і канкрэтным аперацыйным кіраўніцтвам забяспечыць сапраўдны пералом у гэтай справе.

У ГІШПАНІІ
АБВЕШЧАН СТАН АБЛОГІ
УСЯ КРАІНА Ў АГНІ ХВАЛЯВАННЯЎ

МАДРЫД, 8 снежня. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Мадрыда, учора адбылося першае пасяджэнне новага парламента. Часовым старшынёй 234 галасамі (з агульнага ліка 473) выбран Альба, б. міністр пры манархіі, які нядаўна заявіў аб сваім пераходзе ва ўрадавую партыю Леруса (партыя радыкалаў).

Адначасова з адкрыццём парламента ва многіх гарадах успыхнулі хваляванні. Ва ўсёй Гішпаніі абвешчан стан аблогі. У Старагосе адбываюцца вулічныя сутычкі паміж жандарамі і рабочымі. Ёсць параненыя.

Перарваны тэлеграфныя і тэлефонныя правады. Каля Лагроньо рабочыя прабавалі захваціць жандарскія казармы. У мінулую ноч у Барселоне (сталіца Каталоніі) узарвалася 8 бомб.

Масавыя арышты ў горадзе прадаўжаюцца. Паведамляюць таксама аб перастрэлках паміж рабочымі і жандарамі ў раёне Льобрагата (Каталонія). У некаторых месцах пашкавана чыгуначнае палатно, з крычмы чаго зышоў з рэек экспрэс, вышаўшы з Більбао. Тэлефонныя зносіны паміж Парыжам і Мадрыдам спынены.

* * *

БЕРЛІН, 8 снежня. (БЕЛТА).

Вячэрнія газеты перадаюць чуткі аб тым, што ў Мадрыдзе—барыкадныя бані.

ФІНАНСАВЫ КОНТРПРАЕКТ КОМФРАКЦЫІ ФРАНЦУЗСКАЙ ПАЛАТЫ ДЭПУТАТАЎ

ПАРЫЖ, 9 снежня. (БЕЛТА).

Выступіўшы ў спрэчках у палаце дэпутатаў ад імя Комфракцыі Дорыо ўнёс фінансавы контрпраект.

Ён рэзка крытыкаваў урадавы законапраект, падкрэсліўшы, што 85 проц. усяго бюджэтнага цяжара кладзецца проста ці ўкосна на працоўных. З года ў год расце доля падаткаў, уплачваемая працоўнымі. Лік асоб, якія ўплочваюць падаходны падатак з дахода ад 10 тыс. да 20 тыс. франкаў у год, значна вырас, а лік асоб, якія ўплочваюць падатак з дахода, перавышаючага 30 тыс. франкаў, скарацілся на 41 проц.

За апошнія 2 гады ўдзельная вага падатковых паступленняў з асоб, даход якіх не перавышае 20 тыс. франкаў у год, вырас у 2 разы. Доля паступленняў ад асоб, маючых даход звыш 50 тыс. франкаў, зменшылася з 16 да 13 проц., а доля падатковых паступленняў от асоб, якія атрымліваюць даход звыш мільёна ўпала з 22 да 17 проц.

За апошнія 5 год удзельная вага падаткаў на зарплату вырасла з 12 да 21 проц., а доля падаткаў на прамысловы і камерцыйны прыбытак упала з 8 да 7 проц. Апроч таго, буйныя падаткаплатнікі капіталісты, прадпрыемцы і гандляры, сістэматычна перапамяшаюць ці ўтойваюць свой даход ад органаў фіска шляхам розных бухгалтарскіх камбінацый ці іншых злоўжываннаў.

У адной мясцовасці, дзе з 6 тыс. жыхароў у 1.200 ёсць легкавыя аўтамабілі, пры чым з 500 гандляроў, толькі 38 чал. плоцяць падатак. Побач з гэтым трымальнікі папяровых каштоўнасцей на суму, перавышаючую 15 млрд., уцікаюць ад абкладання.

У заключэнне Дорыо прапанаваў для барацьбы з утойваннем даходаў і неаабкладаннем заможных падаткаплатнікаў зрабіць інвентарызацыю ўсіх капіталаў.

Палата адхіліла контрпраект комфракцыі.

Законапраект, унесены сацыялістычнай фракцыяй (групай Блюма), які змяшчаў рад дэмагагічных прапаноў, па сутнасці не закранаўшых інтарэсы капіталістаў, быў адхілен большасцю 403 супроць 123 галасоў. Затым палата большасцю 375 супроць 209 прыняла прапанову ўвесці пры ўсіх банках, якія аплочваюць купоны ўласнікам каштоўных папер, спецыяльны ўлік даходаў гэтых асоб. Прынята таксама прапраўка, якая абавязвае асоб свабодных прафесій весці пастаянную справаздачнасць сваіх даходаў.

ПАДЗЕІ Ў СІНЦЗЯНЕ

АЛМА-АТА, 8 снежня. (БЕЛТА). Камандуючы войскамі Паўночна-Заходняга раёна Сінцзяна кульджынскі ваенны губернатар Чжан выступіў супроць заінвестыцыянага нанкінскім цэнтральным урадам правіцыяльнага ўрада і накіраваў кульджынскія войскі для захопа сталіцы Сінцзяна Урумчы.

У пракламацыі да насельніцтва генерал Чжан аб'яўляе, што ён заключыў згоду з дунганскімі войскамі, якімі кіруе генерал Ма Цзуін, аб падзеле Сінцзяна. Па гэтай згодзе ўлада Чжана павінна быць устаноўлена ва ўсіх паўночных раёнах Сінцзяна—а ўлада Ма Цзуіна — у паўднёвых раёнах.

Выступленне Чжана ўмацоўвае пазіцыю Ма Цзу-іна, звязанага з японскімі інтрыгамі ў Сінцзяне і патрабуючага ператварэння правінцыі ў «незалежную дзяржаву. Адпак, урумчынскія войскі валодаюць перавагу і атрымалі буйную перамогу над дунганскімі часцямі, прабаваўшымі заняць горад Манас (на захад ад Урумчы).

„ОРДР" АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 9 снежня. (БЕЛТА).

Правая «Ордр» палемізуе з заявай, зробленай дэпутатам Ібарнегарэ (нацыяналіст) у камісіі па замежных справах палаты дэпутатаў.

«Матэн» прыпісала яму такую фразу:

«Робячы выбар паміж Германіяй і СССР, мы выбіраем Германію».

«Ордр» па гэтаму поваду піша:

«Францыя не звязана рамкамі гэтай дылемы. Яе выбар, на шчасце, больш шырокі. Яе палітыка па-за гэтай дылемай, гэта — умацаванне ўжо існуючых саюзаў, стварэнне моцнага блока з Бельгіяй, Польшчай і Малой Антантай».

У другім артыкуле газета палемізуе з Коці, які прапануе саюз з Германіяй для крыжовага пахода супроць СССР. Газета заяўляе: «Гэта палітыка таго, хто, спалохаўшыся дажджа, кідаецца ў вайлу».

ФАШЫСЦКАЯ ГЕРМАНІЯ ГРУПУЕ СВАЕ ВАЕННЫЯ СІЛЫ

БЕРЛІН, 9 снежня. (БЕЛТА).

«Фюрэр брыфе» недвузначна пратаварваецца аб сапраўдным сэнсе ператварэння нацыянал-сацыялістскіх штурмавых атрадаў у дзяржаўную арганізацыю і стварэння з усіх паўключаных у штурмавыя атрады і ў «сталёвы шлем» ваенных арганізацый, так званага рэзерва другога разрада.

«Побач з рэйхсвэрам,—піша «Фюрэр брыфе»,—мы маем тут поўнае аб'яднанне ўсіх ваенных сіл нашай краіны пад адзіным кіраўніцтвам».

Адначасова «Фюрэр брыфе» падкрэслівае, што пачатае аб'яднанне паліцыі пад адным цэнтралізаваным кіраўніцтвам, таксама як і адзяржаўленне нацыянал-сацыялістскай партыі па сутнасці ўжо прадстаўляе частковае ажыццяўленне «дзяржаўнай рэформы», якую абяцаюць толькі давяршыць рэформай адміністрацыйнага падзела Германіі і рэформай кіраўніцтва.

АНТЫФАШЫСЦКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ У ВІГО

Парыж, 9 снежня (БЕЛТА).

У сувязі з прыбыццём у порт Віго (Гішпанія) германскага вучэбнага судна «Кёльн» была наладжана антыфашысцкая дэманстрацыя пад лозунгамі адзінага фронта, раздаваліся выгукі: «Няхай жыве германская кампартыя»! «Няхай жыве Дзімітраў»!

ВЫСТУПЛЕННЕ У БЕЛЬГІЙСКАЙ ПАЛАЦЕ ДЭПУТАТАЎ ЗА ПРЫЗНАННЕ СССР

ПАРЫЖ, 9 снежня (БЕЛТА).

З Брусселя паведамляюць, што выступіўшы ў палаце дэпутатаў ад імя камісіі па замежных справах Ван-Ку-Велер у дакладзе заявіў, што ўстанаўленне нармальных совецка-амерыканскіх адносін і развіццё эўрапейскай палітыкі прыдалі новую актуальнасць і сілу довадам на карысць прызнання СССР Бельгіяй.

Барбансон, старшыня бельгійскага металургічнага таварыства «Арбед», прыхільнік устанаўлення нармальных совецка-бельгійскіх адносін—заявіў на сходзе, арганізаваным «таварыствам гаспадарчы і палітыкі Бельгіі», што цяпер «бяглуда імпараваць Совецкі Саюз».

БУЛЛІТ ПРЫБЫЎ У СОВЕЦКІ САЮЗ

НЕГАРЭЛАЕ, 10 СНЕЖНЯ (БЕЛТА). АМЕРЫКАНСКІ ПАСОЛ У СССР БУЛЛІТ ПРЫБЫЎ НА СТ. НЕГАРЭЛАЕ Ў 6 ГАДЗІН ВЕЧАРА І БЫЎ СПАТКАН УПАЎНАВАЖАНЫМ НКЗС ПРЫ УРАДЗЕ БССР Т. ІЛЬІНСКІМ, ВІТАЎШЫМ ПАСЛА АД ІМЯ НАРОДНАГА КАМІСАРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ Т. ЛІТВІНАВА, А ТАКСАМА ПРАДСТАЎНІКАМІ АМЕРЫКАНСКАГА ДРУКУ І ТАСС.

ПАСЛА СУПРАВАДЖАЮЦЬ: ЯГО ДАЧКА ЭНІ БУЛЛІТ, К. МЕРРЫЛЬ — ЧЫНОЎНІК ДЗЯРЖАЎНАГА ДЭПАРТАМЕНТА, ДЖОЗЕФ ФЛАК, 1-Ы САКРАТАР АМЕРЫКАНСКАГА ПАСОЛЬСТВА Ў БЕРЛІНЕ І ДЖОРДЖ КЕННАН — САКРАТАР ПАСОЛЬСТВА ПАЗШ У МАСКВЕ. РАЗАМ З ПАСЛОМ ТАКСАМА ПРЫБЫЛІ ПРАДСТАЎНІК «НЬЮЙОРК ТАЙМС» В. ДЗЮРАНЦІ І ПРАДСТАЎНІК АМЕРЫКАНСКАГА ТЭЛЕГРАФНАГА АГЕНЦТВА Д. БЕРД.

* * *

МЕНСК, 10 СНЕЖНЯ (БЕЛТА). У 8 ГАДЗІН 45 МІНУТ ВЕЧАРА ПРАЗ СТ. МЕНСК ПРАСЛЕДАВАЎ У СПЕЦЫЯЛЬНЫМ ВАГОНЕ АМЕРЫКАНСКІ ПАСОЛ У СССР БУЛЛІТ.

СТАНОВІШЧА НА КУЧ

БЯСЧЫНСТВЫ МАНЧЖУРСКІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ

ХАБАРАЎСК, 8 снежня (Белта).

Манчжурскія прадстаўнікі на КУЧ прадаўжаюць свае незаконныя і дэзарганізуючыя работу дзеянні. Гэтымі днямі манчжурскі памочнік начальніка службы пягі Тян Сі-фу, прысвоіўшы сабе годнасць начальніка службы, самавольна выехаў «для інспектавання» на заходнюю лінію КУЧ, дзе радам незаконных дзеянняў і распараджэнняў пры дапамозе манчжурскай паліцыі паставіў пад пагрозу зрыва работу лініі.

З'явіўшыся 5-га снежня ў кантору 1-га ўчастка службы пягі на ст. Бухеду з памаючым пітаў адносін да КУЧ японскім дараццай Манчжоу-Го Сато і белагвардзейскімі чынамі паліцыі, Тян загадаў паліцыі насільна вывесці з памяшкання канторы в. а. памочніка начальніка ўчастка совецкага грамадзяніна Чэрэўко, чым была парушана ўся работа канторы.

6-га снежня Тян з тым-жа Сато і белымі паліцэйскімі патрабаваў ад служачых канторы ўчастка пягі безумоўнага падпарадкавання незаконна ім назначанаму на пасаду памочніка начальніка ўчастка беламу Едзіновічу, пры чым у сваім старанні падпачаліць совецкіх служачых незаконнаму назначэнцу дарацца міністэрства шляхоў зносін Сато зарваўся да таго, што ўласнаручна збіў рахункавода канторы совецкага грамадзяніна Маркоўскіх, які быў таксама выведзен паліцыяй з канторы. Маркоўскіх і Чэрэўко арыштаваны.

Тян заявіў, што калі прадстаўнікі службы эксплаатацыі не будуць прызнаваць яго назначэнца—белага Едзіновіча, ён дасць распараджэнне паліцыі перашкаджаць выпуску з дэпо паравозаў, падаваемых пад паезды. Гэтыя дзеянні паказваюць, што манчжурскія прадстаўнікі на КУЧ, па-ранейшаму, праводзяць палітыку, накіраваную па дэзарганізацыю і разладжванне нармальнай работы дарогі.

ПРАТЭСТ ГЕНКОНСУЛА СССР ТАВ. СЛАВУЦКАГА

ХАБАРАЎСК, 8 снежня. (БЕЛТА). Генконсул СССР у Харбіне т. Славуцкі наведаў дыпкамісара Манчжоу-Го Шы Люй-беня і заявіў рэзкі афіцыяльны пратэст па поваду адхілення і арышта ў Бухеду т. Чэрэўко, адхілення Маркоўскіх і збойства яго японцам Сато, настойліва патрабаваўшы сёння-ж вызваліць незаконна арыштаваных і неадкладна выклікаць у Харбін Сато для расследвання аб збойстве ім совецкага грамадзяніна і аб яго паводзінах на лініі.

Тав. Славуцкі падкрэсліў, што факты незаконнай замены совецкіх грамадзян кітайскімі падданымі з'яўляюцца прадаўжэннем палітыкі захопа дарогі.

АДКРЫЛАСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ ТЭАТРАЛЬНАЯ НАРАДА

Учора ўвечары фае Беларускага Дзяржаўнага Тэатра адбылося чырвонае палоцнічам: «Створым мастацтва, вартае эпохі другой пяцігодкі»...

А 9-й гадзіне народны камісар асветы тав. ЧАРНУШЭВІЧ адкрыў у памяшканні БДТ першую ўсебеларускую нараду работнікаў тэатраў і відовішчных прадпрыемстваў.

У прэзідыум нарады абраны 40 асоб, у тым ліку т. т. ШАРАНГОВІЧ, ЖЭБРОЎСКІ, ТАМАРКІН (ЦК КП(б)Б), ГЕРЦОВІЧ (ЦК ЛКСМБ), БАЛІЦІН, ЧАРНУШЭВІЧ, ДУНЕЦ, КУДЗЕЛЬКО, народны артыст ГАЛУБОК, заслужаныя артысты РАФАЛЬСКІ, ВЛАДАМІРСКІ, КРЫЛОВІЧ, ГІТГАРЦ, КУМЕЛЬСКІ, КЛІМКОВІЧ, пісьменнікі: АЛЕКСАНДРОВІЧ, ХАРЫК, ЧОРНЫ, ВОЛЬСКІ (Белан), АНДРЭЕЎ і інш.

Пад гучныя воплескі прысутных абіраецца пачэсны прэзідыум у складзе т. т.: СТАЛІНА, КАГАНОВІЧА, ВАРАШЫЛАВА, МОЛАТАВА, КАЛІНІНА ОРДЖОНІКІДЗЕ, КУЙБЫШАВА, ПЯТРОЎСКАГА, КАСІОРА, КІРАВА, МІКАЯНА, АНДРЭЕВА, РУДЗУТАКА, ГІКАЛО, ГАЛАДЗЕДА, ЧЭРВЯКОВА, ГОРКА ГА, ЛЕНСКАГА, КОРЧЫКА, ТЭЛЬМАНА, ДЗІМІТРАВА, ТОРГЛЕРА, ЛЫЧОВА і САХАРАВАЙ.

Аркестр №-скага палка іграе фар фарны марш. На сцэну мерным чоткім крокам узнімаецца дэлегацыя піянераў Варашылаўскай базы (6-й школы).

— Ад імя піянераў завода імя Варашылава прад'яўляем вам — пісьменнікам, драматургам, работнікам тэатра—сацыялістычны рахунак: дайце нам цікавую п'есу, дакладную, інтэсанцёроўку пра нашу вучобу, жыццё, змаганне. У вашай творчай рабоце будні совецкага школьніка адлюстраваны яшчэ надта слаба. Мы заклікаем вас на дапамогу нашай школе сваім мастацкім словам!

Затым старшыня Галоўмастацтва тав. Дунец прадставіў т. Чарнушэвіч слова для даклада аб тэатральным сезоне 1933-34 года і задачах работнікаў тэатральна-відовішчных прадпрыемстваў Беларусі.

Л.

12-га снежня 1933 года ад 8 да 10 гадзін вечара ЦК КП(б)Б

ПРАВОДЗІЦЬ

РАДЫЁПЕРАКЛІЧКУ

па пытанню аб ходзе выканання пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб надзяленні бескароўных калгаснікаў цёлкамі

Ля мікрафона ў кожным раённым цэнтры павінны прысутнічаць сакратары РК КП(б)Б, старшыні РВК, начпалітаддзелаў, загадчыкі райземаддзелаў, дырэктары банкаў і старшыні не менш 4-5 калгасаў.

Даклады робяць сакратары РК КП(б)Б. РК КП(б)Б абавязаны забяспечыць калектыўнае слуханне шырокіх мас калгаснікаў на ўсіх радыёкропках раёнаў.

У радыёперакліччы прымае ўдзел сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО

ЦК КП(б)Б

ПАВЕДАМЛЕННІ

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 14-га снежня 1933 г. а 10 гадзіне раніцы ў г. Менску адбудзецца пасяджэнне рэспубліканскай камісіі па чыстцы па разгляду апеляцый на рашэнні барысаўскай, плешчаніцкай, бярозінскай і бягомльскай раённых камісій наступных т. т.

Справы Барысаўскага раёна:

Лясун С. Л., Сталпкевіч П. В., Федасеєў П. Ф., Гайдук М. І., Шчэрбіцкі С. С., Дзюбко Ф. М., Шымкін Б. А., Дарчук В. А., Лісун І. Г., Крывіцкі І. М., Клімчык І. Н., Хадасевіч А. М.

Справы Плешчаніцкага раёна:

Папкоўскі П. І., Рагоўскі Ф. П., Баброў І. Я.

Справы Бярозінскага раёна:

Янук Г. І., Несцераў І. Ф., Калтун М. І., Кюель П. П., Галецкі А. Д., Махонька В. Д.

Справы Бягомльскага раёна:

Добыш К. В., Дуларэнка І. П., Поляк С. К., Радкевіч А., Сецко Д. Т., Барысаў А. Г., Пятроўскі А. Л.,

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

* * *

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 16-га снежня ў г. Горках адбудзецца пасяджэнне рэспубліканскай камісіі па чыстцы па разгляду апеляцый на рашэнні горацкай райкамісіі, наступных т. т.

Шашавалаў В. Я., Пташкоў Е. А. Залыгінранка Ф. В., Кірушын Е. Д. Шыцікаў П. В., Міхлін Н. Л., Тарасевіч І. Л., Сазінкі І. Д., Станкевіч І. С., Лабусаў П. Т., Васільеў В. Я. Галіцын Г. Г., Ісакаў А. Т., Шэязкоў А. К., Хундуратаў Е. К., Сакорэін В. В., Кавалёў О. Я., Шытікаў П. І., Камінскі С. І., Мацельскі Ф. І., Клімаў Д. І., Казлоў Я. А., Старавойтаў С. Т., Старосцін А. Ф. Калуцкі С. О., Матвейшчыкаў Т. Ф. Бекша Б. А., Чак С. С., Салавейчык Б. С., Пшанічнікаў І. Е., Пехцераў Н. Ф., Сурдоў Д. І., Нозельман М. Е., Ісаакаў Н. П., Луста П. Я., Баркоўскі Ж. А., Шайкін А. Х., Кавалёў А. П., Пенюк Л. М., Журавлёў А. К. Школьнікаў Р. М., Трэйстэр Х. А. Дымент Н. Ю., Шкуратаў С. М., Строк І. Ф., Філіпаў М. Т., Красільшчыкаў І. М., Выгон Е. А., Канюхоў П. Л., Антонаў І. В., Палей Л. Н.,

Яўка вышэйпамянёных таварышоў абавязкова.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

* * *

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 15 і 16 снежня, у 10 гадз. раніцы, у гор. Полацку будзе засядаць рэспубліканская камісія па чыстцы па разгляду апеляцый на пастановы полацкай, вушацкай, дрысенскай, расонскай, сіроцінскай, бешанковіцкай райкамісій наступных таварышоў:

15 снежня ў Полацку:

Зелянкоў В., Курт П. М., Пестуновіч Г. А., Хайцін А. І., Шаразаў Ф. Н., Дамброўскі Т. Н., Сенчанка П. А., Бамуцін І. М., Казінік А. Н., Пліскін А. Х., Нікіфараў П. А., Камінскі Я. І., Шрот І. Е., Дзмітрыеў І. Д.

15 снежня ў Полацку (Сіроцінскі раён)

Папкоў С. В., Ламнёў А. С., Жураўскі М. А., Шаўпоў Е. П., Шулаў І. А., Фрадкоў І. Я., Лабачоў Н. Р., Арлоў А. Е., Сокалаў С. Т., Емельянаў Е. Е., Степанаў І. Д., Белы Ф. М., Алексеєў І. М., Прыходка М. К., Шылаў А. Н., Хадосевіч Н. І., Красоўскі П. Т., Аксенка І. К., Рудзянка Е. П., Прывода М., Гехтер Г. Р., Шарыкаў М. А., Баравікоў В. А., Корзун А. Д., Сакунаў І. Т., Глушаненка А. П., Корзун І. Д., Скобаў І. М., Шаўпоў І.

16 снежня ў Полацку (Дрысенскі раён)

Усціновіч А. Ф., Станкевіч П. С. Мельнікаў А. П., Мятлюк І. І., Гуцман А. Г., Жук І. І., Вайтовіч М. А. Валенцёнак І. К., Шымановіч С. Шатун В. К., Калалёнак І. І., Бобрыкаў Я. Л., Барташевіч Б. Я., Грэйкін А. І., Жук М. А., Шкляр М. К. Пастоўка С. М., Сверыдзін Н. І., Кіпялюшнікаў Д. Е.

16 снежня ў Полацку (Бешанковіцкі раён)

Гаравец Н. І., Гутковіч І. Е., Вітакоўскі П. Т., Гаронін І. А., Волкаў М. М., Гінцвіч Х. Н., Корэін Н. А. Лапацін Е. Н, Окунь Ф П., Гурэвіч А. С.

16-XII у Полацку (Ушацкі раён)

Данісюка І. І., Пізан А. Ф., Кірсбаў І. І., Овадзеў Г. П., Качанаў Ф. І., Тарасевіч Н. А., Баранаўскі Э. А.

16-XII у Полацку (Расонскі раён)

Мякінін Н. В., Бураков А. Н., Бурасенак А. Ф., Бураков П. Ф.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

* * *

Да ведама ўсіх прапагандыстаў і кіраўнікоў старост партсетні г. Менска, што 11-XII—33 г. а 5-й гадзіне ўвечары ў памяшканні дома Камсаветы (пакой № 21) склікаецца адзіраднны семінарый для прапагандыстаў і кіраўнікоў партсетні па пытанню:

1. Аб уключэнні ў падрыхтоўку партсетні да 17 з'езда УсеКП(б) і 17 з'езда КП(б)Б.

Гарком абавязвае ўсіх сакратароў парткалектываў і партгрупаў забяспечыць абавязковую яўку ўсіх прапагандыстаў на гэты семінарый.

Менгарком КП(б)Б.

Рэдакцыя „Звязды" і прэзідыум Белкаапсаюза

склікаюць 11 снежня, у 7 гадзін вечара,

у памяшканні гандлёвага кіраўніцтва БКС (будынак БКС, 2-гі паверх) нараду па пытанню аб адгрузцы тавараў шырокага спажывання.

На нараду запрашаюцца т. т. Драгелеў і Шмуклер (Саюзтвэрзбыт), Вайсман і Мінковіч („Союзхлопкосбыт"), Перкін і Гардон („Кожснабсбыт"), Лобзоў і Шлёнскі („Табакторг"), Кандратук і Генін („Союзстеклофарфор"), Шаевіч („Союзсахар"), Крамер і Кузьміцкі („Союзсоль"), Памеранец і Пукало (Зах. кантора „Метизсбыт"), Гайду (упайнаважаны райнафтагандля), Яхнін („Стальсбыт"), Дабрынскі (Белдрэў), Клёнскі і Аерчак (менская міжраённая база БКС), Шылак (менскі райсаюз), прадстаўнікі 25.150 Гуматраста, Лесаснабзбыта, завода імя Молатава і іншых арганізацый.

„Звязда",
Белкаапсаюз.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА.

12 снежня Балет.

Мастацкі кіраўнік, галоўны дырыжор заслужаны артыст рэспублікі тав. ГІТГАРЦ І. А

ЧЫРВОНЫ МАК

Куз. Глієра.

Пастаноўка балетмейстра КРАМАРЭЎСКАГА Л. М. Дырыжор—Пятроў Г. Н.

Пачатак роўна у 8 гадз. вечара.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

(вул. Валодарскага, 7, тэл. № 21-813)

Сёння, 11 снежня

РЭКРУТ

Пастаноўка заслуж. артыста рэспублікі

М. Ф. РАФАЛЬСКАГА.

Пачатак у 8 гадз. вечара

КІНО ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Гукавы савецкі фільм ЦІХІ ДОН

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Замежны мастацкі фільм ЯЕ КАПРЫЗ

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР — Мастацкі фільм МАЛЕНЬКІ МУК «комедыя (з казкі «1001 ноч»)

КІНО СПАРТАК — Замежны фільм ЗЯЛЁНЫ ЗАВУЛАК драма ў 6 частках.

Заочны Сектар Менскага Вышэйшага Педінстытута

СКЛІКАЕ

ЗАЛІКОВУЮ СЕСІЮ

з 1 па 13 студзеня 1934 г.

На сесію павінны з'явіцца толькі студэнты 2 і 3 курсаў усіх аддзяленняў і ўсіх пыемаў

Прыезд—1 студзеня, заняткі—2 студзеня.

Кожнаму паслана асабістае паведамленне

На сесіі будуць прачытаны лекцыі і праведзены групавыя заняткі выкладчыкамі, таму прысутнасць выклікаемых студэнтаў абавязкова.

Заочны Сектар ВПІ.

КІНО „ПРОЛЕТАРЫЙ" З 11 снежня

лепшая замежная камедыя

КУМІР ПУБЛІКІ

у гал. ролі Бен Тюрпін

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО № 27

Пачатак першага сеанса ў 6 гадз. веч.)—(Каса адкрыта з 4 гадз

УВАГА! УВАГА!

12 снежня ДЗЕННЫ ДАДАТКОВЫ СЕАНС.

Пачатак дадатковага сеанса з 4 гадз. дня.

Навучальны камбінат Беларускай канторы „Союзоргучет"

АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР КУСАНТАЎ на пяцімесячныя КУРСЫ

па падрыхтоўцы бухгалтараў для работы на ільназаводах у сістэме Белільнатрактарацэнтра.

На курсы прымаюцца асобы са стажам работы па рахункаводству не менш двух год і асветай не ніжэй сямігодкі. Стыпендыя ад 110 да 140 р. і квартэрных 25 руб. у месяц. Заявы з дакумэнтамі—1) аб сацыяхаджэнні, 2) аб адукацыі, 3) аб узросце, 4) аб працоўным стажы, 5) даведка аб ослабленні з апошняга месца работы—накіроўваць па адрасу: Менск, Міхайлаўская 1-4, навучальнаму камбінату „Союзоргучет".

Тэрмін падачы заяў—18 снежня г. г.

Заявы без дакумэнтаў разглядацца не будуць. Аб залічэнні і пачатку заняткаў будзе паведамлена на пошце.

Навучальны Камбінат „Союзоргучета".

ЗГУБЛЕНА круглая пячатка праф кома тэхнікума сувязі. Лічыць несапраўдным.

СПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА на 1934 г.

ИЗОБРЕТАТЕЛЬ

орган ЦС таварыства вынаходнікаў

Штомесячны журнал, які асвятляе пытанні масавага вынаходніцтва і рацыяналізацыі

Подпісная цана: на 12 мес.—9 руб., 6 мес.—4 р. 50 к. 3 мес.—2 р. 25 коп.

ИЗУЧАЙ ТЕХНИКУ

орган УсеЦСПС

Штомесячны масавы папулярны навукова-тэхнічны журнал.

Подпісная цана: 12 мес.—6 руб., на 6 мес.—3 р., на 3 мес. 1 р. 50 коп.

ТЫРАЖЫ ЖУРНАЛАЎ АБМЕЖАВАНЫ

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Масква 6, Страстной бульвар 11, Жургазоб'яднанне і ўсюды поштай і аддзяленнямі Союздрука

Жургазоб'яднанне.

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКА

разам з фінгрупай НК РСІ і Цэнтральным праўленнем саюза ФБР

15 СНЕЖНЯ, у 7 гадз. веч. у памяшканні Беларканторы Дзяржбанка,

склікае НАРАДУ ўсіх гаспадарчых, гандлёвых, бюджэтных і прафсаюзных арганізацый

па пытанню аб недахопах у рабоце Дзяржбанка па крэдытнаму і разліковаму абслугоўванню кліентуры.

На нараду запрашаюцца кіраўнікі ўстаноў і прадпрыемстваў, галоўбухі, планавыя работнікі, інкасатары і ўсе іншыя, жадаючыя прыняць удзел.

РАГАЧОЎСКАЯ БУХГАЛТАРСКА-ЭКАНАМІЧНАЯ ШКОЛА БЕЛКААПСАЮЗА

ПРАВ ДЗІЦЬ НАБОР

на аднагадовыя курсы бухгалтараў

у кольласці 90 чалавек і 6-ці месячныя курсы рахуніводаў у кольласці 60 чал. На курсы прымаюцца выключна сяючыя сямігодку або маючыя веды за сямігодку ва ўзросце ад 18 да 35 год. Будуць прымацца: рабочыя і іх дзеці, калгаснікі, беднякі-аднаасобнікі, сераднякі, служачыя з працоўнай інтэлігенцыі. Перавага пры прыёме аддаецца рахункоўным працаўнікам, працуючым у сістэме спажывецкай кааперацыі.

Усе курсанты забяспечваюцца стыпендыяй у размеры ад 30 да 50 рублёў у залежнасці ад паспяховасці. Усе прыезджыя забяспечваюцца інтэрнатамі, падручнікамі і неабходнымі навучальнымі прыналежнасцямі. Дакумэнты тыя-ж, што і ў іншыя навучальныя установы, вымяюцца ў арыгіналах, з дадаткам заседча найклеты і 40 коп. маркамі. Дакумэнты падаць да 20-XII па адрасу: г. Рагачоў, і оцыяліст. школа, 4 а па школа. Неаформленыя дакумэнты разглядацца не будуць. Даведкі аб соцыяльна-эканамічным становішчы павінны быць за 1933 г. Пачатак заняткаў 1 студзеня 1934 года.

Дырэкцыя.

Тэлефон сектара абвестак № 21-350

УВАЗЕ РАБОТНІКАЎ І ЧЛЕНАЎ АСОАВІЯХІМА І ПВА

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1934 г. ОСОАВИЯХИМ

орган ЦС Асоавіяхіма. Двухтыднёвы ілюстраваны масавы папулярны абаронны журнал. Падпісная цана: на 12 мес.—6 р., на 6 мес.— 3 р., на 3 мес.—1 р. 50 к

ХИМИЯ И ОБОРОНА

орган ЦС Асоавіяхіма па пытаннях хіміі і ПВА, штомесячны журнал, разлічаны на шырокія масы асоавіяхімаўцаў, у першую чаргу на актыў хімічнай, ваенна-хімічнай і процівапаветранай работы.

Падпісная цана: на 12 мес.—6 руб., на 6 мес.—3 руб., на 3 мес. 1 р. 50 коп.

САМОЛЕТ

орган ЦС Асоавіяхіма. Штомесячны журнал разлічаны на авіяцыйны актыў Асоавіяхіма, работнікаў грамадзянскага паветранага флота, на кваліфікаваных кадры рабочых і сярэдні камандны склад авіяпрамысловасці.

Падпісная цана: на 12 мес.—9 руб., на 6 мес.—4 р. 50 коп., на 3 мес.—2 р. 25 коп.

Падпіска прымаецца: Масква, 6, Страстной бульвар, 11, Жургазоб'яднанне ўсюды поштай і аддзяленнямі Союздрука.

Жургазоб'яднанне

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на 1934 год на цэнтральную ўсебеларускую газету

„ЗВЯЗДА"

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

У газеце „ЗВЯЗДА" будуць шырока асвятляцца ўсе матэрыялы XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда УсеКП(б).

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на 1 мес.—2 р. 40 к., на 3 мес.—7 р. 20 к., на 6 м.—14 р. 40 к., на 12 м.—28 р. 80 к.

Падпіска прымаецца: Поштай і лістаносцамі, ўпаўнаважанымі па распаўсюджванню друку на прадпрыемствах, ва ўстановах, а таксама газетнымі кіёскамі

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

СЁННЯ, 11-га снежня ў Доме пісьменніка склікаецца

АГУЛЬНЫ СХОД ПІСЬМЕННІКАЎ.

ПАРАДАК ДНЯ:

Даклад тав. АНДРЭЯ Александровіча „Пралетарская барацьба на мовазнаўчым фронце і новы правапіс беларускай мовы".

ПАЧАТАК роўна а 7 гадзіне веч. ПРАХОД ВОЛЬНЫ.

Менск, друкарня «Звязды» Галоўлітбел № 337.